№ 36 (538) 4 кастрычніка 2007

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

# Выбары замацавалі вынікі рэвалюцыі



PHOTO.BYMEDIA.NET

Украіна прагаласавала за ўкраінскамоўных, але ўкраінскамоўным давядзецца мірыцца зь Януковічам. Старонка 4.

### Інтрыгоўны візыт Сідорскага ў Літву

Беларусь упершыню афіцыйна ўзьняла пытаньне магчымага свайго ўдзелу ў пабудове новай Ігналінскай АЭС. **Старонка 3.**

### КДБ датычнае да выбухаў у Віцебску?

Супрацоўніка УКДБ па Віцебскай вобласьці маёра Андрэя Дз. падазраюць у датычнасьці да выбухаў 2005 году. **Старонка 7.**

### Біскуп Дзям'янка адслужыў імшу за Сваяка па-польску

Іаланта Валуевіч, краязнаўца зь вёскі Спонды: і цяпер, як і пры жыцьці, у Казіміра Сваяка некаторыя шпурляюць камяні. **Старонка 6.**

### Усё ня так

А што, калі ўсё, што кажуць на БТ, — чыстая праўда? Піша Віталь Тарас. **Старонка 14.**

## Парлямэнцкая дэмакратыя



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Лідэр Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька з боем прарваўся ў палату прадстаўнікоў. Старонка 16.**

## Сустрэча з рэдактарамі «ARCHE», «Нашай Нівы» і Андрэем Хадановічам

**12 кастрычніка** сустракайце рэдактара часопісу «ARCHE» **Валера Булгакава**, рэдактара газэты «Наша Ніва» **Андрэя Скурка** і паэта **Андрэя Хадановіча ў 15.30 у Бялынічах і ў 18.30 у Магілёве**. Дзе пройдуць сустрэчы, можна дазнацца праз т.: (029) 620-32-10 (Алег, Бялынічы) і 388-35-61 (Алег, Магілёў).

## Мілінкевіч перадаў прэмію Севярынцу

Праскае Таварыства міжнароднага супрацоўніцтва прысудзіла Аляксандру Мілінкевічу прэмію за Грамадзянскія заслугі імя Ганны Эленбоген. Прэмія імя Эленбоген раней прысуджалася былому прэзыдэнту Чэхіі Вацлаву Гаўлу, былой дзяржсакратарцы ЗША Мадлен Олбрайт, былому каралю Румыніі Міхаю, піяністу Ўладзімеру Ашкеназі. Паводле традыцыі, атрымальнік узнагароды перадае яе маладому чалавеку. Мілінкевіч перадаў яе Паўлу Севярынцу.

П.Севярынец падзякаваў за такі гонар. «Мілінкевіч годны чалавек, які заслужыў гэтую прэмію. Яму хапіла мужнасьці, каб узяць на сябе крыж змаганьня з апошняй дыктатурай Эўропы. Мілінкевіч зрабіў тое, што ня мог зрабіць ніводзін беларускі палітык цягам апошніх пятнаццаці гадоў. Ён вярнуў у беларускую палітыку пачуцьце цьвярозасьці, не страціўшы пачуцьця духоўнасьці. Тое, што Мілінкевіч перадае прэмію мне — гэта ўчынак ўганараваньня дзясятка «маладафронтаўцаў», якія прайшлі праз крымінальныя суды», — сказаў П.Севярынец.

**МБ, ЗП**

### АД РЭДАКЦЫІ

## Камэдыя дэль'артэ з сур'ёзным вынікам

Выбары ва Ўкраіне на першы погляд уяўляліся руціннай працэдурай, чарговым актам у спэцыфічнай «камэдыі дэль'артэ», якой падаецца звонку палітычная барацьба ў краіне над Дняпром, зь яе своеасаблівымі няпісанымі правіламі. Аднак вынік гэтых выбараў зноў мае вялікае значэньне для нашай суседкі, а таксама Беларусі і ўсяго рэгіёну.

Насуперак спадзяваньням ворагаў і асьцярогам сяброў, выбары даказалі, што Аранжавая рэвалюцыя не была выпадкам, адзінкавым уздымам згалелых масаў і нацыянальнай інтэлігенцыі, але была плёнам глыбіннага працэсу. Ва Ўкраіне ёсьць сталае запатрабаваньне на ўкраінскамоўных, праэўрапейскіх лідэраў, людзі галасуюць за іх, нават разумеючы іх слабасьці і заганы, пакуль на гэтае, постсавецкае пакаленьне, няма лепшае зьмены.

Для Беларусі больш эфэктыўны ўрад у Кіеве стане лепшым партнэрам у энэргетыцы. Краіны дагэтуль не сфармавалі транзытнага саюзу. Між тым у кааперацыі зь Літвой і, шырэй, Балтыяй, Скандынавіяй і Польшчай, яны могуць утварыць надзвычай эфэктыўны рэгіянальны хаўрус.

Расея так і не змагла аднавіць свой уплыў ва Ўкраіне, як і ў Малдове і Грузіі. Гэта таксама запомняць беларускія палітыкі.

Больш пра выбары ва Ўкраіне — **старонка 4**.

# Чалавек верасьня: Сяргей Сямёнаў

Ад гэтага месяца пачынаючы «Наша Ніва» прапануе сваім чытачам вызначаць асобу ці асобаў месяца — людзей, учынкі і дасягненьні якіх найбольш запомніліся цягам гэтых трыццаці дзён. Ад сёньня і да канца верасьня ўсе ахвотныя могуць прагаласаваць за аднаго з кандыдатаў, праз апытанку на сайце. Прапануем вашай увазе сьпіс першых намінантаў і першага ляўрэата.

**Сяргей Сямёнаў.** Унікальны выпадак гомельскага актывіста апазыцыі Сяргея Сямёнава прымусіў высокіх чыноўнікаў загаварыць пра ўціск беларускамоўных. Гамяльчук пасьлядоўна прасіў беларускамоўныя бланкі мытных дэкларацыяў, едучы за мяжу, і сутыкаўся з адмовамі супрацоўнікаў мытні. Сямёнаў прынцыпова так і ня стаў запаўняць расейскамоўныя бланкі, за што на яго быў складзены пратакол па адміністрацыйным парушэньні, па якім пазьней ён атрымаў 930 тысячаў рублёў штрафу. Наступны раз хлопец таксама аказаўся верным сабе, за што атрымаў яшчэ адзін адміністрацыйны пратакол. Разам з тым, дзякуючы ўчынку Сямёнава пра беларускую мову і яе ўціск загаварылі старшыня Канстытуцыйнага суду Рыгор Васілевіч і старшыня мытнага камітэту Аляксандар Шпілеўскі.

Працяг на старонцы 11.

### АПЫТАНЬНЕ НА NN.BY

**Вынікі галасаваньня па стане на 1 кастрычніка**

| | |
|---|---|
| Сяржук Сямёнаў | 133 (26 %) |
| Уладзімер Канаплёў | 6 (1,2 %) |
| Наста Азарка, Яраслаў Грышчэня, Іван Шыла | 72 (14,1 %) |
| гурт «Крама» | 53 (10,4 %) |
| Уладзімер Арлоў | 56 (11 %) |
| Бэрнд Штанге | 3 (0,6 %) |
| Андрэй Рыбакоў | 4 (0,8 %) |
| мітр. Тадэвуш Кандрусевіч | 68 (13,3 %) |
| манахі М'янмы | 116 (22,7 %) |

Усяго прагаласавала: 511

# Інтрыгоўны візыт Сідорскага ў Літву

Беларусь упершыню афіцыйна ўзьняла пытаньне магчымага свайго ўдзелу ў пабудове новай Ігналінскай АЭС.

Прэм’ер-міністар Беларусі Сяргей Сідорскі 3 кастрычніка выправіўся з аднадзённым працоўным візытам у Літву.

Як паведамляе агенцтва БЕЛТА, С.Сідорскі ўзяў удзел у цырымоніі адкрыцьця пятай Нацыянальнай выставы «БеларусьЭКСПА», якая пройдзе 3—6 кастрычніка ў Вільні, і сустрэўся зь літоўскімі бізнэсоўцамі.

Акрамя таго, адбылася сустрэча беларускага прэм’ера зь ягоным літоўскім калегам Гедымінасам Кіркіласам.

У пятніцу С. Сідорскі сустракаўся з паслом Літвы ў Беларусі Эдмінасам Багдонасам. У часе гутаркі беларускім бокам упершыню афіцыйна было ўзьнятае пытаньне магчымага ўдзелу Беларусі ў пабудове новай Ігналінскай АЭС.

Паводле словаў Сяргея Сідорскага, Беларусь і Літва як транзытныя краіны падобныя ў падыходах да вырашэньня пытаньняў энэргетычнай бясьпекі.

С.Сідорскі паінфармаваў Эдмінаса Багдонаса аб тым, што ў Беларусі ажыцьцяўляюцца маштабныя праграмы, каб да 2010 году скараціць энэргаёмістасьць ВУП на 30 працэнтаў. «Гэта значныя пляны, але мы зробім усе захады для дывэрсыфікацыі паставак энэргарэсурсаў», — сказаў ён.

«Думаю, і для ЭС, і для Літвы гэтыя пытаньні гэтаксама важныя», — сказаў прэм’ер і адзначыў, што Беларусь гатова аказаць адпаведную падтрымку ўраду Літвы ў рэалізацыі аналягічных праграм.

«Мы ведаем, што вы працуеце з суседнімі балтыйскімі краінамі дзеля будаўніцтва АЭС», — сказаў С.Сідорскі. Ён падкрэсьліў, што Беларусь уважліва адсочвае гэтыя пытаньні і зацікаўлена ў супрацоўніцтве зь Літвой па такіх праектах.


PHOTO.BYMEDIA.NET
Сяргей Сідорскі.

Паводле словаў Сяргея Сідорскага, Беларусі гэты праект цікавы ў сувязі з тым, што краіна ў бліжэйшы час зьбіраецца будаваць сваю АЭС.

С.Сідорскі адзначыў, што зьвярнуўся да прэм’ерміністра Літвы «па даручэньні прэзыдэнта Беларусі».

Літва ў кааперацыі з Польшчай і балтыйскімі краінамі будуе новую АЭС у Ігналіне, згодна з эўрапейскімі стандартамі.

**Мікола Бугай;**
**інф. БЕЛТА**

## ЦЫТАТА

## Рар: Беларусь знаходзіцца ў вырашальным пункце сваёй гісторыі

Нямецкі палітоляг расейскага паходжаньня **Аляксандар Рар** у інтэрвію радыё «Свабода»:

«Беларусь знаходзіцца ў вырашальным пункце сваёй гісторыі. Яна павінна дапускаць у сваю краіну інвэстараў — расейскіх, якія і цяпер працуюць у краіне, альбо заходніх. Гэта важнае палітычнае рашэньне, якое павінны прыняць у кіраўніцтве Беларусі. Гэта складана, таму Лукашэнка і ягоныя паплечнікі цяпер спрабуюць у апошні момант дамовіцца з пуцінскай Расеяй ці па-свойму ціснуць на Расею, якая ў эўрапейскім кантэксьце таксама знаходзіцца ў няпростым становішчы. Яна таксама павінна прыдумаць стратэгію, як далей працаваць з Захадам, калі і перад Расеяй многія дзьверы на Захадзе зачыняюцца».

**«Праскі акцэнт», радыё «Свабода»**

## СЬЦІСЛА

### Янчэўскі прыйшоў, каб зьмяніць Праляскоўскага?

Былы кіраўнік Беларускага патрыятычнага саюзу моладзі, былы дэпутат палаты прадстаўнікоў і цяпер ужо былы намесьнік дырэктара Інстытуту сацыяльных і палітычных дасьледаваньняў пры Адміністрацыі прэзыдэнта Ўсевалад Янчэўскі прызначаны першым намесьнікам начальніка Галоўнага ідэалягічнага ўпраўленьня Адміністрацыі прэзыдэнта.


PHOTO.BYMEDIA.NET

Да яго намесьнікам Алега Праляскоўскага быў Уладзімір Холад, якога затрымалі па падазрэньні ў хабарніцтве і неўзабаве будуць судзіць.

### Рыгоні даведаецца, дзе знаходзіцца Беларусь

З 16 да 19 кастрычніка зь візытам у Беларусі будзе знаходзіцца дакладчык палітычнага камітэту Парлямэнцкай асамблеі Рады Эўропы Андрэа Рыгоні. Ён мяркуе азнаёміцца з сытуацыяй у краіне. Лідэр АГП Анатоль Лябедзька лічыць, што «было б лягічней, каб сп.Рыгоні наведаў Беларусь падчас «Эўрапейскага маршу», каб у канцэнтраваным выглядзе атрымаць адказ на тыя пытаньні, якія яго хвалююць».

**МБ**

# Украіна прагаласавала за ўкраінскамоўных

Пераканаўчага посьпеху на датэрміновых парлямэнцкіх выбарах ва Ўкраіне дасягнуў блёк Юліі Цімашэнкі.

Вынікі датэрміновых парлямэнцкіх выбараў ва Ўкраіне ў значнай ступені аказаліся сэнсацыйнымі. Партыі, якія ўзначальваюць Юлія Цімашэнка і Віктар Юшчанка, дасягнулі нашмат лепшага выніку, чым на папярэдніх выбарах, і нават чым прадказвалі сацыёлягі на першых этапах кампаніі.

Адставаньне блёку Цімашэнкі ад Партыі рэгіёнаў скарацілася ў параўнаньні зь мінулымі выбарамі з 11 да 3,5 %.

Разам партыі Цімашэнкі і Юшчанкі атрымаюць 228 мандатаў у новай Радзе. У папярэдняй яны мелі пасьля выбараў 208, прычым за час існаваньня Рады Януковіч перакупіў 3 дзясяткі дэпутатаў зь іхных шэрагаў.

Партыя рэгіёнаў і кампартыя, што абапіраюцца на расейскамоўнае насельніцтва ўсходу Ўкраіны, будуць мець у новай Радзе 202 мандаты.

Яшчэ 20 месцаў зоймуць прадстаўнікі дробнай цэнтрысцкай групоўкі без выразнай ідэалягічнай пазыцыі.

Вынікі выбараў з розьніцай да 0,1—0,4% супалі з дадзенымі чатырох праведзеных экзыт-полаў. Назіральнікі таксама ацэньваюць магчымасьць фальшаваньня выбараў ва Ўкраіне ў 1 %. Выбарчы працэс там празрысты, у склад камісій уваходзяць прадстаўнікі ўсіх палітычных сілаў, датэрміновае галасаваньне абмежаванае 0,5% ад выбарцаў, а назіральнікі маюць магчымасьць сачыць за ўсімі этапамі падліку галасоў. У гэтым адрозьненьне ўкраінскай выбарчай працэдуры ад беларускай.

Пасьля падліку 99,5% бюлетэняў, Партыя рэгіёнаў Віктара Януковіча мае 34,3%. У сьпіну ёй дыхаюць цімашэнкаўцы з 30,7%. Затым — «Наша Ўкраіна» (14,2%). У Камуністычнай партыі 5,4%. Блёк Літвіна атрымаў 4%.

На беларускіх выбарных участках найбольшую колькасьць галасоў набрала Партыя рэгіёнаў.

Юлія Цімашэнка спадзяецца сфармаваць урад. На тое самае разьлічвае і Віктар Януковіч. Прэзыдэнт Юшчанка ў сераду зьвярнуў заклік да фармаваньня ўрадавай кааліцыі да ўсіх трох асноўных палітычных сілаў, што можа быць знакам таго, што ён хацеў бы ўтварэньня шырокай кааліцыі, якая б задавальняла і ўсход, і цэнтар краіны.

Ю. Цімашэнка ў адказ заявіла, што ня ўвойдзе ў адну кааліцыю з Партыяй рэгіёнаў.

**Мікола Бугай**

| | |
|---|---|
| Партыя рэгіёнаў | 34,31% |
| Блёк Юліі Цімашэнкі | 30,75% |
| «Наша Ўкраіна — Народная Самаабарона» | 14,18% |
| Кампартыя | 5,38% |
| Блёк Літвіна | 3,96% |
| Сацыялісты | 2,86% |



# Пышныя абяцаньні Юліі Цімашэнкі

Праграма нацыянал-кансэрватараў называлася «Украінскі прарыў». Цімашэнкаўцы прапанавалі выбарцам папулісцкую сумесь вялікіх ідэяў і малых абяцаньняў.

«Мы абіраем шлях справядлівасьці, шлях яднаньня ўкраінскага народу. Місія ўкраінскага народу — адбудаваць грамадзтва вышэйшай маралі, дзе гармонічна будуць спалучацца асабістая свабода, абароненасьць і дастатак», — такімі пышнымі словамі пачынаецца перадвыбарная праграма Юліі Цімашэнкі.

Праграма нацыянал-кансэрватараў называлася «Украінскі прарыў». Цімашэнкаўцы зрабілі стаўку на вялікія ідэі. Яны запрапанавалі выбарцу ня толькі «стабільнасьць» ці «дэмакратыю». У грунце іхнай прапановы было стварэньне новай агульнанацыянальнай задачы для маладой нацыі. Украінцам, перадусім маладому пакаленьню, гэта імпанавала. Сярод выбарцаў у веку да 30 гадоў блёк Цімашэнкі атрымаў абсалютную большасьць галасоў.

Цімашэнкаўцы не абмежаваліся рыторыкай. Яны правялі выключна напружаную агітацыйную кампанію. З уласнага прызнаньня Юліі Цімашэнкі, найбольшым ейным жаданьнем было дачакацца 29 верасьня, калі канчалася перадвыбарная агітацыя, каб можна было троху адпачыць.

«Юля», як называюць яе ўкраінцы, праехала рэгіёны ўздоўж і ўпоперак. Прычым паўтара вырашальнага месяца палітык правяла пераважна не на Кіеўшчыне і захадзе, дзе нацыянал-дэмакраты наймацнейшыя, а ў палітычна нявызначаных рэгіёнах цэнтру і поўдня з выездамі на ўсход. Нават галасавала яна ў сваім родным Днепрапятроўску, а ня ў Кіеве, як іншыя палітыкі.

Юлія вядомая як выключны аратар і прамоўца. Прамовы Цімашэнкі выклікалі ў людзей усю палітру пачуцьцяў і адчуваньняў: ад сьмеху да сьлёзаў.

Сваю перадвыбарчую кампанію Юлія Цімашэнка правяла выключна на ўкраінскай мове — хоць сама па-ўкраінску ўпершыню ў жыцьці загаварыла толькі ў 1999 годзе, калі прыйшла ва ўрад.

Ключавымі ідэямі кампаніі былі салідарнасьць, духоўнасьць, праўдзівасьць і справядлівасьць. Цімашэнка паабяцала якасна новыя грамадзкія каналы тэлебачаньня і радыё, незалежнасьць судовай сыстэмы.

Вялікая стаўка была зробленая на сацыяльную палітыку. У выпадку перамогі Цімашэнка паабяцала, што за выхаваньне і адукацыю дзяцей будуць аднолькавыя кошты як у дзяржаўных, так і ў прыватных установах адукацыі, зьявяцца мэдычныя страхоўкі для бедных, якія будзе купляць дзяржава, працоўныя на год атрымаюць яе ад прадпрыемства, для ўсіх зьявіцца асабісты рахунак, на які будуць ісьці ашчаджэньні на пэнсію на працягу ўсяго жыцьця.

Цімашэнка выступае за замежныя інвэстыцыі ва ўкраінскую эканоміку, пры гэтым засьцерагаючы, што права на зямлю будуць мець толькі грамадзяне Украіны.

Цімашэнка гуляла на нотках незадаволенасьці насельніцтвам дзеяньнямі ўладаў: «Мы разьядноем карупцыйнае аб'яднаньне ўлады і капіталу. Улада несправядлівая, бо бескантрольная».

**Зьміцер Панкавец**

### Лёлік Ушкін з Кіева: Вынікі выбараў сэнсацыйныя

«Вынікі выбараў можна назваць сэнсацыйнымі. Ніхто не чакаў, што такі вялікі працэнт атрымае блёк Юліі Цімашэнкі. Ужо сёньня зразумела, што менавіта Цімашэнка і будзе зьяўляцца найгалоўнейшай прэтэндэнткай на прэзыдэнцтва ў 2009 годзе.

У тым выпадку, калі Віктар Януковіч зможа цягам гэтых двух гадоў утрымаць у сваіх руках Партыю рэгіёнаў і яна не разваліцца на асобныя фракцыі, то ён у стане стварыць канкурэнцыю Цімашэнкі на прэзыдэнцкіх выбарах.

Нечаканай выглядае і перамога блёку Літвіна, паводле папярэдніх прагнозаў мала хто думаў, што ён пройдзе ў парлямэнт.

Упершыню ад моманту развалу СССР вырас рэйтынг у камуністаў, што таксама выглядае сэнсацыйным. Напэўна, што цяпер можна прагназаваць у Кіеве нейкі палітычны цырк, нейкія пратэсты на Майдане. Падаецца, што гэта будзе рабіцца Партыяй рэгіёнаў і іх хаўрусьнікамі толькі для таго, каб падтрымаць палітычны імідж».

**ЗП**

### Мікола Рабчук: Для ўкраінскага прарыву патрэбныя непапулярныя крокі

Вынікі датэрміновых парлямэнцкіх выбараў камэнтуе ўкраінскі філёзаф Мікола Рабчук:

«Найхутчэй, усё ж будзе сфармаваная аранжавая кааліцыя. Але гэтыя палітыкі настолькі папулісты і шчодрыя на ўсялякія абяцанкі, што ўрэшце Украіна ад гэтага ня выйграе. Дзеля сапраўднага ўкраінскага прарыву патрэбныя не папулісцкія, а наадварот, непапулярныя сярод насельніцтва крокі. Баюся, што гэты парлямэнт будзе няздольны на такое».

**ЗП**

# Аранжавы варыянт стаў Менску выгаднейшы

Камэнтуе **Аляксандар Класкоўскі.**

На ўкраінскіх выбарах нарабіў фурору блёк Юліі Цімашэнкі. Камэнтатары адразу загаварылі пра імаверны рэмэйк аранжавай кааліцыі (блёк Цімашэнкі плюс праюшчанкаўская «Наша Украіна»). Прычым ёсьць меркаваньне, што менавіта аранжавы варыянт болей выгадны беларускаму кіраўніцтву. Па-першае, каб ямчэй супрацьстаяць энэргетычнаму дыктату Масквы. Па-другое — празаходні Кіеў можа стаць пасярэднікам у дыялёгу з Брусэлем.

Аналітык Андрэй Фёдараў, падкрэсьлівае і такі момант: ужо цяжэй будзе страшыць беларускі электарат аранжавым пудзілам. Раней было: во, давялі краіну сваімі майданамі да хаосу і бязладзьдзя! Зараз, хутчэй за ўсё, абыдзецца бяз вулічнага высьвятленьня адносінаў.

Сапраўды, асноўныя гульцы загадзя паабяцалі з годнасьцю прыняць вэрдыкт ЦВК. Выпрацоўваецца культура кампрамісаў. Сыстэма пакрысе набывае збалянсаванасьць на якасна іншым, болей дэмакратычным узроўні.

Такім чынам, можна ўсталяваць канкурэнтную і празрыстую палітычную сыстэму, даць адносна вольна дыхаць партыям ды прэсе — і разам з тым не абрынуць стабільнасьць, не разваліць эканоміку, а, наадварот, запусьціць новыя чыньнікі яе разьвіцьця.

Можна чакаць, прагназуе Андрэй Фёдараў, што Эўразьвяз дасьць Украіне абяцаныя прэфэрэнцыі — візавыя льготы, новыя інвэстыцыі ды іншыя пернікі.

Экспэрт дадае: афіцыйны Менск змушаны цяпер шукаць каапэрацыі зь Кіевам незалежна ад таго, хто там на кані. Энэргетычны ціск Масквы аб'ектыўна спрыяе пэўнай эвалюцыі замежнапалітычнага мысьленьня беларускага кіраўніцтва.

# Біскуп Дзям’янка адслужыў імшу ў гонар Сваяка па-польску

Іаланта Валуевіч, краязнаўца зь вёскі Спонды: «І цяпер, як і пры жыцьці, у Сваяка некаторыя шпурляюць камяні».



CATHOLIC.BY

30 верасьня біскуп Антоні Дзям’янка наведаў касьцёл у вёсцы Засьвір (Мядзельскі раён), дзе адслужыў Сьвятую Імшу ў інтэнцыі за знакамітага каталіцкага сьвятара, беларускага паэта Канстанціна Стаповіча (Казіміра Сваяка). Сваяк з 1920 да сьмерці, да 1926, служыў у гэтым касьцёле.

Дзіўна, але Антоні Дзям’янка Імшу вёў на польскай мове, хоць імша была за беларуса, сьвятара-патрыёта. Як вядома, палякі ў 1920-я дзяўблі ксяндза, які прынцыпова заставаўся беларускамоўным, высылалі яго, хворага, у самыя глухія парафіі.

Падчас імшы біскуп асьвяціў памятную дошку ў гонар Казіміра Сваяка. Нядаўна такім жа чынам ушанавалі знакамітага сьвятара ў касьцёлах вёсак Камаі і Клюшчаны.

У Засьвірскім касьцёле на памятнай дошцы ёсьць словы: «стараўся быць чыстай і простай мыслі». Сам К.Сваяк прасіў пахаваць яго на радзіме, у Клюшчанах, і напісаць гэтыя словы на надмагільным помніку.

Памятную дошку вырабіў майстар-самавучка з Гудагаю, Валер Бурдун. А ініцыятарам ідэі ўшанаваньня памяці знакамітага земляка была Іаланта Валуевіч, краязнаўца зь вёскі Спонды, што на Астравеччыне. Пасьля імшы яна выступіла з рэфэратам пра жыцьцёвы шлях К.Сваяка. Узрушылі яе словы пра тое, што цяпер, як і пры жыцьці, у Казіміра Сваяка шпурляюць камяні, нават некаторыя сьвятары, за яго беларускасьць і за яго паэтычнасьць.

**Нарачанскі партал, narach.org**

# У Жодзіне невядомыя разбурылі помнік Леніну


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Удары наносіліся цяжкім тупым прадметам.

Інцыдэнт адбыўся 27 верасьня, напярэдадні дня гораду, каля 9-й ранку. Невядомыя адбілі галаву, плечы і правую руку. Удары наносіліся цяжкім тупым прадметам.

Міліцыя пачала апытваць сьведак, але ніхто нічога пэўнага сказаць ня мог. Адбітыя дэталі сабралі ў пакеты і адвезьлі на экспэртызу. Заведзена крымінальная справа, вядзецца сьледзтва.

**ЮД**

# Гомельскае УКДБ працягвае шукаць «Малады Фронт»

Дазнавальнік УКДБ па Гомельскай вобласці Андрэй Коласаў 27 верасьня дапытаў Андрэя Цянюту і вынес пастанову аб прызнаньні яго падазраваным у дзейнасьці ад імя незарэгістраванага «Маладога фронту».

Сьцьвярджаецца, што А.Цянюта, «рэалізуючы злачынную задуму, дыскрэдытуе дзяржаўныя органы ўлады і кіраваньня, дэстабілізуе сацыяльна-палітычную абстаноўку, уцягвае моладзь у шэрагі структуры для арганізацыі агітацыйна-прапагандысцкіх мерапрыемстваў радыкальнай накіраванасьці».

Гаворыцца таксама, што А.Цянюта «стварае ў грамадзтве ілюзію наяўнасьці шырокага супрацоўніцтва дзейнай уладзе».

А.Цянюта на допыце ні на якія пытаньні не адказваў, скарыстаўшы сваё права не даваць паказаньняў.

Супрацоўнікі КДБ пераатрэсьлі і кватэру яго бацькоў у часе, калі ён нядаўна адбываў адміністрацыйны арышт. Сканфіскаваныя кампутар, кнігі і газэты.

**МБ**

# Вольгу Казуліну выгналі з працы


PHOTO.BYMEDIA.NET

Старэйшую дачку палітвязьня Аляксандра Казуліна звольнілі з працы. Раней ёй вынесьлі дысцыплінарнае спагнаньне. Вольга Казуліна працавала на прадпрыемстве «Альактыў» намесьнікам дырэктара ў прававых і кадравых пытаньнях.

Паводле Вольгі Казулінай, да таго цягам чатырох з палавай месяцаў ёй не плацілі заробак на прадпрыемстве. «Дырэктар ведае, што я адна гадую дзіця. Мой бацька палітзьняволены і цяпер мяне выкідаюць на вуліцу», — сказала дачка В.Казуліна.

**Радыё «Свабода»**

# КДБ датычнае да выбухаў у Віцебску?

Супрацоўніка УКДБ па Віцебскай вобласьці маёра Андрэя Дз. падазраюць у датычнасьці да выбухаў, якія адбыліся ў Віцебску ў 2005 годзе.

Такую інфармацыю атрымала інтэрнэт-выданьне «Народныя навіны Віцебску», у якое зьвярнулася маці маёра, Ніна Дз.

Больш за два месяцы Андрэй Дз. знаходзіцца пад сьледзтвам і ўтрымліваецца ў СІЗА ў Менску.

Калі два гады таму на віцебскіх вуліцах прагрымелі два выбухі, кіраўнік дзяржавы прынародна абвясьціў: «Датычных да тэракту ахламонаў затрымалі».

Сапраўды, двум грамадзянам зь Віцебску было прад'яўленае абвінавачваньне ў цяжкім злачынстве. Паўгоду іх трымалі ў сьледчым ізалятары, дамагаючыся ад іх прызнаньня. Але, як пазьней высьветлілася, арыштаваныя ніякіх адносінаў да таго, што адбылося, ня мелі.

Пасьля па абвінавачваньні ў датычнасьці да тэрактаў у турму на пэўны час кінулі знанага лідэра апазыцыі Паўла Красоўскага, але мусілі неўзабаве выпусьціць пасьля пратэстаў грамадзкасьці і праваабаронцаў з усяго сьвету.

Затое ў СМІ нядаўна зьвярнулася віцьблянка Ніна Дз.

Сайт «Народныя навіны Віцебску» прыводзіць толькі кароткі зьмест яе ліста:

«Зьвяртаецца да Вас маці маёра УКДБ па Віцебскай вобласьці Дз. А. М. У Генэральнай пракуратуры рэспублікі ў адносінах да майго сына ўзбуджаная крымінальнай справа па арт. 295 ч.3 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусі… Перад правядзеньнем ператрусу была прад'яўлена пастанова, у якой гаварылася аб выбухах, што адбыліся ў 2005 г.; пры асабістай сустрэчы са мной сьледчы Генэральнай пракуратуры Расолька А.Ф., сказаў, што мой сын Дз. А. М. мае адносіны да выбухаў на плошчы Свабоды ў г.Віцебску ў 2005 г.… Гэтыя абвінавачваньні неабгрунтаваныя. Мой сын — удзельнік групы па расьсьледаваньні падзеяў 2005 г. У ягоным паслужным сьпісе толькі падзякі і ўхваленьні, як на ўзроўні ўпраўленьня, дзе ён служыць, так і ад самога старшыні КДБ Рэспублікі Беларусі».

Супрацоўнікі КДБ карыстаюцца паслугамі сваіх агентаў. Вось маёр Дз. меў «вушы» зь ліку цывільных асобаў. Нехта Г. раней асуджаны за цяжкое злачынства па арт. 295 Крымінальнага кодэксу. Ня так даўно ў ягоным гаражы выявілі выбуховыя рэчывы. І быццам бы Г. на пытаньне, дзе ўзяў, заявіў: «Атрымаў ад свайго куратара з КДБ».

Маёра Дз. ўзялі пад варту ў менскае СІЗА. Правялі ператрусы ва ўсіх ягоных сваякоў, але аніякіх доказаў знойдзена не было. Два месяцы маёр знаходзіцца ў зьняволеньні. Цікава, што гэта здарылася літаральна праз некалькі дзён пасьля выступу кіраўніка дзяржавы аб навядзеньні парадку ў КДБ.

Сваякам, у тым ліку маці, не дазваляюць спатканьняў. Ніна Дз. вельмі занепакоена станам ягонага здароўя, таму што ў сына язва страўніка, ён раней быў праапэраваны, увесь час прымае лекі. Сьледзтва ў сваіх інтарэсах пазбавіла Дз. сустрэчаў са сваякамі, забаранілі нават ліставаньне.

Жонка падазраванага, Натальля Дз. (што паказальна, супрацоўніца юрыдычнага аддзелу гарвыканкаму), гаворыць, што ўжо не шукае справядлівасьці ў дзяржаўных структурах і спадзяецца толькі на дапамогу журналістаў.

Дарэчы, паводле словаў маці арыштаванага, віцебскія афіцэры КДБ на сходзе паручыліся за калегу ў тым, што ён не схаваецца ад сьледзтва, і разбору справы перашкаджаць ня будзе. Але сьледчы з рэспубліканскай пракуратуры быў строгі ў сваім рашэньні. Больш за тое, заявіў Ніне Дз., што яе сын мае адносіны да тэрактаў у Віцебску двухгадовай даўніны.

Асаблівую нотку ўносіць той факт, што маёр Дз. быццам бы ўваходзіў у склад групы па расьсьледаваньні выбухаў, якія адбыліся ў Віцебску ў 2005 годзе.

Ніна Дз. зьвярталася са скаргамі ў розныя ўладныя структуры. Адказу на свае звароты яна так і не атрымала. Жонка маёра двойчы запісалася на асабісты прыём да Генэральнага пракурора, але чыноўнік яе не прыняў.

Тэрмін утрыманьня Дз. пад вартай працягнулі яшчэ на 2 месяцы. Раней падазраваныя па гэтай справе людзі пакутвалі ў ізалятары паўгоду.




**ВЫБУХІ Ў ВІЦЕБСКУ**
**адбыліся 14 і 22 верасьня і 8 сьнежня 2005 году. Ахвяраў не было, але сьвет народу параніла. Напачатку многія аглядальнікі зьвязвалі выбухі з жаданьнем нейкіх сілаў дэстабілізаваць сытуацыю ў краіне перад выбарамі і апраўдаць рэпрэсіі супраць апазыцыі. Вінаватых дагэтуль не знайшлі, хоць у арышце пабывалі аж тры юнакі.**

### Былым падазроным у віцебскіх выбухах заплацілі за 6 месяцаў у СІЗА

Як паведаміла «Эўрапейскае радыё для Беларусі», з былых падазроных па справе да выбухаў у Віцебску братоў Мурашкаў абвінавачваньні ў злачынстве зьнятыя цалкам. Ім нават выплацілі кампэнсацыю за 6 месяцаў знаходжаньня ў сьледчым ізалятары. Суму кампэнсацыі Юра Мурашка назваць адмовіўся, толькі зазначыў: «Калі сыходзіць з тых прэцэдэнтаў, якія былі, то сума даволі дастатковая».

Гаварыць на тэму, ці рабіўся на братоў у часе сьледзтва фізычны ціск, Юры Мурашка катэгарычна адмовіўся. Сказаў толькі, што марыць усё забыць, як страшны сон.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

У цэнтры — Аляксандар Макаеў.

# Кароткі страйк прадпрымальнікаў

**Аляксандар Макаеў:** Шумчанка выступіў у ролі страйкбрэхера.

2 кастрычніка ў Беларусі адзначаўся Дзень прадпрымальніка. Частка дробных прадпрымальнікаў адзначыла сьвята страйкам. У Менску, Баранавічах, Салігорску, Віцебску, Бабруйску, Вузьдзе, Барысаве прыпынілі працу дробныя гандляры. Арганізатары выступу дэкляруюць, што іх было нават 30 тысячаў.

У Менску не працавалі ждановіцкія будаўнічы і радыёрынак, «Паркінг» на Куйбышава, гандлёвыя цэнтры «Купалаўскі», «Эўропа», «Зеркало». Часткова сталі «Bigzz» і «Экспабел».

Старшыня каардынацыйнай рады прадпрымальнікаў менскіх рынкаў Аляксандар Таўстыка распавёў, што мэтай папераджальнай акцыі было прыцягнуць увагу да іх патрабаваньняў.

На думку сп. Таўстыкі, улады не пачулі прадпрымальнікаў. Дэлегацыя гандляроў перадала старшыні сталай камісіі палаты прадстаўнікоў па прамысловасьці, паліўна-энэргетычным комплексе, транспарце, сувязі і прадпрымальніцтве Анатолю Паўловічу каля тысячы подпісаў за адмену ўказу прэзыдэнта №760. Усяго такіх подпісаў сабрана больш за 20 тысячаў.

Гандляры з «Дынама», Камароўскага рынку й «Імпульсу» працавалі. Паводле актывістаў «Пэрспэктывы», што там працуюць, іх не папярэдзілі пра акцыю.

А.Таўстыка тлумачыў: сярод прадпрымальнікаў няма адзінства: «Лідэр «Пэрспэктывы» Анатоль Шумчанка назваў нашу акцыю правакацыяй, таму, я думаю, і працуе сёньня «Дынама».

Спадары Макаеў і Таўстыка заклікалі калегаў прыйсьці 14 кастрычніка на «Эўрапейскі марш». Паводле іх жа зьвестак, лідэр «Пэрспэктывы» А.Шумчанка плянуе зладзіць чарговы мітынг на Бангалоры 5 лістапада.

Ля «Паркінгу» Аляксандар Макаеў быў затрыманы. Яго адвезьлі ў РУУС Савецкага раёну. Калі ўдзельнікі страйку грамадою падышлі да пастарунку, Макаева адпусьцілі.

Да «Паркінгу» наведаўся начальнік упраўленьня прадпрымальніцтва Менгарвыканкаму Аляксандар Каліноўскі, які выслухаў пытаньні страйкоўцаў. Была прызначана сустрэча з удзелам прадстаўнікоў Міністэрства падаткаў, Адміністрацыі прэзыдэнта ды іншых зацікаўленых дзяржструктураў.

Лідэры прадпрымальнікаў агучылі некалькі прапановаў. Калі ўлады ня пойдуць на саступкі, з 1 студзеня прадпрымальнікі пагражаюць пайсьці ў адпачынак на месяц, каб ня сплочваць студзеньскія падаткі.

**Сямён Печанко**

## СЬЦІСЛА

### Арыштаваны наклад «Товарища»

У пятніцу ў рэдакцыю газэты левых сілаў завіталі супрацоўнікі АМАПу і паказалі паперы з дазволам на канфіскацыю накладу газэты. Забралі каля 20 тыс. асобнікаў. Нумар «Товарища» быў цалкам прысьвечаны «Сацыяльнаму маршу» 4 лістапада.

**Зьміцер Панкавец**

### Эўрасаюз ганарыцца «Эўрапейскім маршам»

ЭС прывітаў беларусаў, якія наважыліся правесьці «Эўрапейскі марш» у Менску 14 кастрычніка.

Эўракамісар у пытаньнях зьнешніх сувязях і палітыкі добрасуседзтва Бэніта Фэрэра-Вальднэр заявіла, што «Марш» сьведчыць пра жаданьне народу Беларусі адказаць на прапановы Эўразьвязу пра больш цесныя сувязі.

Прэс-сакратар Эўракамісіі Амадэў Альтафаж Тардыё заявіў: «Грамадзяне Беларусі адчулі, што Эўропа падтрымлівае іх памкненьні. Мы трымаем кантакт з арганізатарамі, падзяляем іх клопаты і ганарымся тым, што яны лічаць Эўропу адным з сваіх прыярытэтаў».

### Жадобіна просяць дазволіць ускласьці кветкі каля турмы НКВД

Кіраўнікі грамадзкага камітэту ўшанаваньня памяці ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў накіравалі старшыні КДБ ліст з просьбай дазволіць ім ускласьці кветкі да будынку турмы КДБ (раней — НКВД) у сталіцы. У ёй у ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 г. было расстраляна больш за 100 выдатных дзеячоў беларускай інтэлігенцыі. Адсюль, з «амэрыканкі», пачалася дарога ў Курапаты дзясяткаў тысяч людзей.

У пісьме, накіраваным новапрызначанаму кіраўніку КДБ выкладзеная просьба дазволіць вечарам 29 кастрычніка групе зь дзесяці чалавек пакласьці краскі і запаліць зьнічы пад мурамі турмы.

**МБ**

# Гонар галоўнага ідэоляга каштуе 27 мільёнаў

У панядзелак судзьдзя Ленінскага раёну Менску Тацяна Жулкоўская вынесла абвінаваўчы прысуд незалежнай газэце «Народная Воля» і яе журналістцы Марыне Коктыш. Рашэньнем суду з «Народнай волі» спагоняць 25 млн рублёў, а з журналісткі — 2 млн на карысьць кіраўніка галоўнага ідэалягічнага ўпраўленьня Адміністрацыі прэзыдэнта РБ Алега Праляскоўскага. Першае судовае паседжаньне па гэтай справе адбылося 26 верасьня.

Прэтэнзіі галоўнага ідэоляга краіны выклікала публікацыя «Ўладзімер Холад па-ранейшаму знаходзіцца на свабодзе» у нумары «НВ» ад 2 жніўня. Пра самога Праляскоўскага там было ўсяго некалькі радкоў, якія і сталі падставай для звароту ў суд з мэтай абароны годнасьці і дзелавой рэпутацыі.

Судзьдзя Жулкоўская, якая летась асудзіла на два гады турмы праваабаронцу Кацярыну Садоўскую, амаль цалкам задаволіла пазоў ідэоляга.

Хіба толькі замест 28 мільёнаў, якія патрабаваў пазоўнік, «Народная Воля» будзе сплочваць 25 мільёнаў, наконт Коктыш пакараньне засталося такім жа, як і патрабаваў пазоўнік.

«Я дагэтуль не разумею, як можна прызнаць не адпаведнай рэчаіснасьці, да прыкладу, фразу «но Пролесковский на свободе», і якім чынам гэтая фраза можа зьняважыць ягоны гонар…» — пракамэнтавала вынік суду Марына Коктыш.

«Сярэдзіч чамусьці не запрашаў на працэс журналістаў», — дзівіцца праваабаронца Валер Шчукін, які прысутнічаў на вынясеньні прысуду. Ён дзеля гэтага спэцыяльна прыехаў зь Віцебску. Уся працэдура, паводле ягоных словаў, доўжылася 15 хвілінаў.

На працягу 10 дзён адказчыкі зьбіраюцца падаць скаргу на судовае рашэньне ў Менскі гарадзкі суд. Касацыйная скарга можа разглядацца цягам месяца. Калі рашэньне будзе адмоўным, празь дзесяць дзён з моманту разгляду касацыйнай скаргі штрафы трэба будзе сплаціць.

Алег Праляскоўскі паабяцаў выйграныя ў судзе грошы накіраваць на дапамогу аднаму зь беларускіх дзіцячых дамоў. Выплата такога буйнога штрафу зноў ставіць пад пытаньне далейшы выхад незалежнага выданьня.

Па іроніі лёсу 1 кастрычніка, у дзень вынясеньня прысуду, — дзень народзінаў і ў Іосіфа Сярэдзіча, і ў Алега Праляскоўскага. Галоўнаму рэдактару «Народнай Волі» споўнілася 58 гадоў, галоўнаму ідэолягу — 44.

**Зьміцер Панкавец**

# Марына Коктыш: Я ўсё зрабіла як сапраўдны журналіст


Юлія Дарашкевіч

**«Наша Ніва»: Вы чакалі, што публікацыя пра арышт Уладзімера Холада можа стаць падставаў для звароту ў суд сп.Праляскоўскім?**

**Марына Коктыш:** Безумоўна, што не чакала. Мне падалося, што ў гэтым артыкуле я зрабіла ўсё, як і павінен рабіць сапраўдны журналіст. Я сабрала поўны спэктар меркаваньняў адносна арышту Холада. Патэлефанавала ў МУС, ягонай жонцы, выказаўся на гэты конт і сакратар ЦВК Мікалай Лазавік. Усё было зроблена вельмі акуратна. У самім артыкуле хапала словаў-маркераў кшталту «кажуць», «ёсьць меркаваньне», «ходзяць чуткі». Толькі пасьля ішла фраза «але Праляскоўскі знаходзіцца на свабодзе». Я не абвінавачвала ідэоляга ні ў якіх злачынствах і не заклікала пасадзіць яго ў турму. Але суд не ўспрыняў нашы довады. Мне здаецца, што я ўсё зрабіла правільна.

**«НН»: Ці чаканым для Вас стаў вырак суду?**

**МК:** Яшчэ да пачатку афіцыйнага працэсу мы хацелі неяк залагодзіць справу. Сустракаліся з адвакатам Праляскоўскага, але ніякія нашы прапановы не былі пачутыя. Пазоўнік быў адразу настроены рашуча ісьці да канца. Рашэньне судзьдзі Жулкоўскай было адначасова і чаканым і нечаканым. Я да апошняга спадзявалася, што суд прыме бок газэты. На працэс прыходзілі чытачы, якія казалі, што «Народная воля» ні ў якім выпадку не зьбіралася абразіць Алега Праляскоўскага. Але ж вы самі цудоўна ведаеце, што такое беларускі суд. Апраўдаць нас у спрэчцы з такім высокім чыноўнікам судзьдзя проста не наважылася. Цяпер мы будзем абскарджваць рашэньне, і спадзяюся, што хоць у некага з судзьдзяў хопіць сумленьня і мужнасьці прыняць наш бок.

**ЗП**

# Забаранілі пікет — вывесіў сьцяг

Ініцыятарам пікетаў выступіў Сяргей Панамароў, мясцовы актывіст і выдавец незалежнага бюлетэню «Бойкі Клецак». Усяго 30 верасьня павінна было прайсьці 4 пікеты, кожны зь іх мусіў адбыцца побач з дамамі заяўнікаў. У адмове, падпісанай старшынём райвыканкаму Анатолем Бойкам, гаварылася, што перш чым падаваць заяўку на пікет, неабходна было вырашыць гэтае пытаньне з праваахоўнымі органамі, мэдычнай установай і пажарнымі ды аплаціць іхныя паслугі.

У выніку акцыя прайшла ў іншай форме: клецкія актывісты наладзілі раздачу бюлетэню. Варта адзначыць, што да 16-й гадзіны каля дому С. Панамарова знаходзіўся міліцэйскі пост, а за ім самім у часе раздачы «БК» хадзіў патруль. Пасьля 16-й, калі міліцыянты зьехалі, сп. Панамароў узьняў над сваім жытлом двухмэтровы бел-чырвона-белы сьцяг. Міліцыянты так і не наважыліся яго зьняць.



СЯМЁН ПЕЧАНКО

СП

**24 верасьня**

### На суткі за Эўрамарш

Судзьдзя Партызанскага суду Менску **Алена Ціцянкова** асудзіла **Віталя Ціхановіча** ды **Аліну Гладкую** на 15 і 7 сутак арышту адпаведна. У часе затрыманьня ў іх знайшлі інфармацыйныя матэрыялы пра Эўрасаюз, аднак судзілі за «хуліганства». Сьведкамі выступілі супрацоўнік ППС **Міхаіл Сачук** і міліцыянт-кіроўца Партызанскага РУУС **Аляксей Паталей**.

**25 верасьня**

### Адклікаць дэпутата — злачынства

Наваполацкі гарадзкі суд пакараў штрафамі грамадзкіх актывістаў **Валер'я Шаўчэнку**, **Ігара Сухарукава** ды **Антона Ясіновіча**. Актывістаў судзілі паводле арт. 9.10 Адміністратыўнага кодэксу — парушэньне парадку адкліканьня дэпутатаў. Нагадаем, што наваполацкія актывісты ладзілі збор подпісаў за адкліканьне дэпутатаў ад Наваполацку, якія падтрымалі адмену ільготаў. Судзьдзя **Пятро Ляўчонак** прысудзіў В. Шаўчэнку 1 050 тыс. рублёў штрафу, а судзьдзя **Аляксандар Федзюкевіч** пакараў І.Сухарукава на 900 тыс. ды А. Ясіновіч на 750 тыс. рублёў (адпаведна 35, 30 і 25 базавых велічыняў).

**26 верасьня**

### Суд у Берасьці

Суд Маскоўскага раёну Берасьця пакараў актывіста Руху «За Свабоду» **Андрэя Шарэнду** 15 суткамі адміністрацыйнага арышту за ўдзел у прэзэнтацыі кнігі **Паўла Севярынца** «Лісты зь лесу». **Судзьдзя Вольга Сьмірнова** кваліфікавала дзеяньні А.Шарэнды, як удзел у несанкцыянаваным сходзе. У бліжэйшыя дні юнака чакае яшчэ адзін суд. Яго вінавацяць у супраціве міліцыі. Па дарозе ў суд ён паспрабаваў заступіцца за **Паліну Панасюк**, якая хацела перадаць яму перадачу.

### На пяць сутак за налепкі «Эўрапейскага маршу»

Студэнта-каліноўца **Яўгена Скрабутана** арыштавалі на 5 сутак. Яго затрымалі з налепкамі «Эўрапейскага маршу», але судзілі паводле абвінавачаньня ў нецэнзурнай лаянцы. Прысуд вынесла судзьдзя Кастрычніцкага раённага суду Горадні **Людміла Жук.** Затрымлівалі Скрабутана участковыя інспэктары **Генадзь Пышынскі** і **Віктар Адзярэйка**. У Яўгена сканфіскавалі для правядзеньня экспэртызы налепкі, значкі ды інш., пры гэтым быў складзены пратакол.

**27 верасьня**

### Арыштавалі «Товарищ»

Раніцай у рэдакцыю недзяржаўнай **газэты «Товарищ»**, як толькі зьявіўся новы нумар выданьня, завіталі **супрацоўнікі Ленінскага РУУСу і АМАПу**. Яны цікавіліся, ці сапраўды газэта друкуецца ў Смаленску. Паабяцалі, што пасьля праверкі наклад будзе вернуты нам назад. Усяго было сканфіскавана каля 20 тысячаў асобнікаў. Сканфіскаваны нумар «Товарища» фактычна цалкам прысьвечаны «Сацыяльнаму маршу» 4 лістапада, а таксама пікетам, прызначаным на 30 верасьня амаль ва ўсіх гарадах Беларусі. У Жлобіне днём раней сканфіскавалі 7 тыс. асобнікаў газэты.

### Севярынца выпускалі з Івацэвіч

У чацьвер раніцай на волю выйшаў палітык **Павал Севярынец**. 10 верасьня ён быў асуджаны **судзьдзёй Ж.Капачэўскай** да 17 сутак арышту за акцыю салідарнасьці зь **Яраславам Грышчэнем**. 16 сутак арышту Севярынец правёў у баранавіцкім ізалятары, але ў сераду ўвечары палітыка вывезьлі ў Івацэвічы, дзе ён дабыў рэшту арышту.

### Ізноў Берасьце

Суд Маскоўскага раёну Берасьця аштрафаваў грамадзкага актывіста **Рамана Кісьляка** на 2 базавыя велічыні. Яго абвінавацілі ва ўдзеле ў несанкцыянаваным сходзе 19 жніўня. Сходам суд палічыў прэзэнтацыю кнігі Паўла Севярынца «Лісты зь лесу». Гэта ўжо другі суд над Р.Кісьляком.

### Гомельскія Курапаты

Гомельская абласная суполка ПКБ, абласная арганізацыя АГП і Рада гарадзкой арганізацыі Партыі БНФ атрымалі адказ ад старшыні абласнога Савету дэпутатаў **Сіліцкага В.С.** на сваю прапанову ўтварыць грамадзкую камісію ў сувязі з правядзеньнем раскопак рэштак пахаваньня на тэрыторыі Гомельскага раёну. У дакумэнце гаворыцца, што паколькі знойдзеныя фрагмэнты парэштак перададзеныя ў пракуратуру для правядзеньня судова-мэдыцынскай экспэртызы з наступным узбуджэньнем крымінальнай справы, то няма неабходнасьці стварэньня такой камісіі.

### Сьледзтва па справе Захаранкі

Сьледзтва па справе зьнікненьня генэрала **Юры Захаранкі** працягнутае яшчэ на 3 месяцы, да 24-га сьнежня. Пра гэта паведамілі ў пракуратуры Менску. Пры гэтым не ўдакладняецца, якія сьледчыя дзеяньні праводзяцца па гэтай справе.

Нагадаем, былы міністар унутраных справаў і адзін зь лідэраў апазыцыі Юры Захаранка зьнік у траўні 1999 году.

### Дваццаць адна забарона пікетаваць

Сябры гарадзенскай філіі АГП атрымалі 21 адмову з гарвыканкаму — менавіта столькі заявак і падавалі на правядзеньне пікетаў супраць адмены сацыяльных ільготаў. Нагода: нібыта прызначаныя для правядзеньня пікету месцы не ўваходзяць у пералік месцаў, зацьверджаных гарвыканкамам. Сябры АГП плянавалі правесьці 30 верасьня пікеты супраць адмены льготаў ва ўсіх мікрараёнах гораду.

**28 верасьня**

### Штраф за прэзэнтацыю

На 620 тыс. рублёў аштрафаваная берасьцейская актывістка **Кацярына Бельская**. **Судзьдзя Сьмірнова** прызнала яе вінаватай ва ўдзеле ў несанкцыянаваным сходзе — прэзэнтацыі кнігі Паўла Севярынца. Два тыдні таму суд вярнуў пратакол аб правапарушэньні на дапрацоўку ў аддзел міліцыі Маскоўскага раёну Берасьця.

**29 верасьня**

### Не пусьцілі за мяжу

Баранавіцкаму актывісту незарэгістраванага «Маладога Фронту» **Яраславу Грышчэню** мясцовае КДБ адмовіла ў атрыманьні штампу на выезд за межы краіны. Маладафронтавец мусіў вылецець у Страсбург дзеля ўдзелу ў грамадзкіх слуханьнях пры Парлямэнцкай Асамблеі Рады Эўропы.

**30 верасьня**

### З асаблівым цынізмам

У Менску затрымалі за распаўсюд газэты «Товарищ» актывістаў ПКБ **Валер'я Ўхналёва**, **Зьмітра Яненку** і журналіста **Генадзя Шарыпкіна**. Валер Ухналёў паведаміў, што ў пастарунку яму закінулі раздачу мінакам друкаванага органу партыі «з асаблівым цынізмам».

СП

# Чалавек верасьня: Сяргей Сямёнаў

**Працяг са старонкі 2.**

**«Маладафронтаўцы».** Цягам месяцу адразу траіх «маладафронтаўцаў» прыцягнулі да крымінальнай адказнасьці паводле артыкула 193 ч.1 КК «Удзел у незарэгістраванай арганізацыі». Спачатку ў адзін дзень 4 верасьня ў Салігорску і Нясьвіжы судзілі Івана Шылу і Насту Азарку. Іван Шыла, яшчэ школьнік, і Наста годна вытрымалі працэсы. 10-га ж верасьня ў Баранавічах прайшоў суд над Яраславам Грышчэнем. Хлопец, каб падкрэсьліць усю абсурднасьць працэсу папрасіў у апошнім слове прымяніць супраць яго расстрэл. Суд аказаўся больш гуманным, даўшы Яраславу 30 базавых велічынь штрафу. На сёньня рыхтуюцца яшчэ тры крымінальныя справы супраць «маладафронтаўцаў» — у Сьветлагорску, Гомелі і Жлобіне.

**Уладзімер Канаплёў.** Адстаўка па ўласным жаданьні з пасады сьпікера сябра дзяцінства Аляксандра Лукашэнкі спарадзіла мноства чутак і здагадак. У афіцыйную вэрсію — абвастрэньне стану здароўя — ня верыць ніхто, акрамя рэдактара «Советской Белоруссии». Сам Канаплёў пакуль ня даў ніводнага інтэрвію, каб хоць неяк праліць сьвятло на гэтую адстаўку.

**Гурт «Крама».** Новага альбому вядомых беларускіх рокераў чакалі цэлых шэсьць гадоў. На прэзэнтацыю ў клюбе «Фартуна» альбому «Ўсё жыцьцё — дзіўны сон» прыйшло шмат людзей, сярод якіх была поп-сьпявачка Іна Афанасьева.

**Уладзімер Арлоў.** Пісьменьнік выдаў новую кнігу — «Імёны Свабоды», у якую ўвайшлі замалёўкі пра вядомых і ня вельмі беларускіх гістарычных пэрсанажаў. «У кніжцы 261 партрэт. Уладзімер Арлоў зрабіў такую малую энцыкляпэдыю беларускай свабоды», — лічыць рэцэнзэнт, гісторык Алег Гардзіенка.

**Бэрнд Штанге.** За немцам сачылі, на немца спадзяваліся. Ён не пабаяўся адправіць на пэнсію былых лідэраў зборнай, даючы дарогу зусім яшчэ маладым футбалістам. Экспэрымэнты Штанге пакуль не прыносяць вынікаў. Цягам месяцу зборная прайграла румынам і славенцам. Аднак не забываемся, што да канца восені Штанге папрасіў у заўзятараў і журналістаў карт-блянш на экспэрымэнты.

**Андрэй Рыбакоў.** Магілёўскі цяжкаатлет на чэмпіянаце сьвету ў тайляндзкім Чыянгмаі ўсталяваў новы сусьветны рэкорд у рыўку і заваяваў залаты мэдаль па суме двух практыкаваньняў. Посьпех беларускай школы цяжкай атлетыкі грунтуецца на выдатных спэцыялістах і добрай працы з моладзьдзю. У цяжкай атлетыцы стаўка робіцца менавіта на мясцовых спартоўцаў, а не на легіянэраў. Ёсьць выдатныя пэрспэктывы на Алімпіяду-2008.

**Мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч.** Менска-Магілёўская дыяцэзія атрымала новага кіраўніка. Ім стаў былы мітрапаліт Маскоўскі, беларус Тадэвуш Кандрусевіч. Першае інтэрвію новапрызначаны мітрапаліт даў «Нашай Ніве». Сярод прыярытэтаў Тадэвуша Кандрусевіча: поўны Катэхізіс па-беларуску, дакумэнты Другога Ватыканскага сабору, мясцовыя сьвятары для кожнай парафіі, дыялёг з уладамі і праваслаўнай царквой. 26 верасьня мітрапаліт адслужыў першую імшу ў Катэдры. Канчаткова ў Беларусь Кандрусевіч вернецца ў першай палове лістапада.

І на знак салідарнасьці мы далучаем да верасьнёўскага сьпісу таксама **будысцкіх манахаў М'янмы**.

**Зьміцер Панкавец**

# Сяргей Сямёнаў:
# Трэба беларусізаваць ВНУ і войска

Пераможца апытаньня «НН» на званьне чалавека месяца **Сяргей Сямёнаў** прызнаецца, што гэта было для яго досыць нечаканым. Сам бы ён вылучыў у верасьні манахаў М'янмы.



**Сяргей Сямёнаў**
нарадзіўся ў 1981 у Гомелі. Удзельнічаў у дэмакратычным руху. Цяпер атрымлівае адукацыю ва Украіне.

**«Наша Ніва»: Ці лічыш ты сам свой выпадак унікальным? Бо ўпершыню высокія чыноўнікі загаварылі пра ўціск беларускай мовы.**

**Сяргей Сямёнаў:** Яшчэ ў 2005 г. у Гомелі быў выпадак, калі ў ЗАГСе адмаўляліся весьці працэдуру жаніцьбы па-беларуску. Маладыя тады таксама дамагліся свайго. Пасьля таго, як мне прысудзілі штраф фактычна за карыстаньне беларускай мовай, рэзананс ад абсурднасьці сытуацыі атрымаўся досыць вялікім. У чыноўнікаў не было выбару. Сказаць, што я ня меў рацыі, фактычна азначала б зьняважыць дзяржаўную мову, а гэта крымінал.

**«НН»: Адстаяць правы на беларускамоўныя блянкі для цябе было прынцыпова?**

**СС:** Так. Калі была ўведзеная крымінальная адказнасьць за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі, каб не парушаць закон, шмат хто быў вымушаны сысьці з грамадзкай дзейнасьці. Калі дзяржава патрабуе ад нас выкананьня нормаў закону, то тое ж можам патрабаваць і мы.

**«НН»: Дзе сёньня беларускамоўныя яшчэ могуць рэальна адстаяць свае правы?**

**СС:** Па-першае, гэта ВНУ. Пачынаць можна з патрабаваньня дазволіць здаваць усе ўступныя іспыты і тэсты па-беларуску. Пасьля паступленьня патрабаваць беларускамоўнага навучаньня. Па-другое, гэта войска. Усе загады ў войску аддаюцца па-расейску. Зрэшты, каб беларусізаваць войска трэба вельмі моцныя фізычныя і маральныя сілы. У арміі можна спадзявацца толькі на сябе.

**Гутарыў ЗП**

# Малако зьбягае ў Расею

Малаказаводы сутыкнуліся з праблемай дэфіцыту сыравіны. Вытворцы малака вывозяць сваю прадукцыю ў Расею, дзе закупныя кошты ўдвая вышэйшыя.

Праблемы з сыравінай на сталічных малаказаводах пэрыядычна ўзьнікалі на працягу верасьня. 1 кастрычніка два з трох менскіх заводаў прыпынілі пастаўкі малака ў гарадзкія крамы. Гарадзкі малаказавод №2 забясьпечыў малаком дзіцячыя садкі і больніцы, а ў крамы патрапілі толькі малочныя прадукты. Менскія заводы на сёньня атрымліваюць ад пастаўшчыкоў толькі палову неабходнага аб'ёму сыравіны. Сытуацыю на прадпрыемствах тлумачаць тым, што ў Расеі закупныя кошты ўдвая вышэйшыя. Туды і зьбягае беларускае малако.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Вытворцы малака карыстаюцца ня толькі выгаднай кан'юнктурай, але й адтэрміноўкай Расельгаснагляддам ўводу новага парадку імпарту прадукцыі жывёлагадоўлі зь Беларусі да 1 лістапада.

У Беларусі за Лукашэнкам ужо здараліся перабоі з пастаўкамі ў крамы малочных прадуктаў. Як і цяпер, прычынай былі больш прывабныя закупныя цэны ў Расеі. Тады пытаньне вырашылі адміністрацыйным спосабам — забаранілі вываз сыравіны.

**Сямён Печанка**

# Беларусы масава ашукваюць польскіх працадаўцаў

Беларускія гастарбайтэры атрымліваюць працоўныя візы ў Польшчу, аднак да месца працы не зьяўляюцца.

Польская газэта «Metro» паведамляе, што падобныя праблемы пачаліся ад моманту спрашчэньня Польшчай працэдуры працаўладкаваньня замежнікаў у краіну. Ад 20 ліпеня бягучага году польскаму працадаўцу дастаткова падаць заяву ў бліжэйшую ўправу па працы, запоўніць фармуляр ды заплаціць 100 злотых. Фармуляр адсылаецца найміту ў Беларусь, Украіну, ці Расею. Фармуляр гарантуе аўтаматычнае атрыманьне працоўнай візы на 3 месяцы. Пры гэтым ня трэба стаяць у чарзе.

«Metro» прыводзіць факты «зьнікненьня» адразу пасьля перасячэньня польскай мяжы сотняў украінцаў — польскі працадаўца аплаціў прыезд 300 чалавек, даехала ўсяго 20.

Выданьне паведамляе, што з аналягічнай праблемай сутыкнулася і польскае генкольсунства ў Горадні.

Маўчаньне польскіх працадаўцаў ускосна можна патлумачыць значным недахопам працоўнай сілы ў Польшчы. Толькі ў будаўнічай сфэры не хапае 400 тыс. працоўных.

Дагэтуль беларускія СМІ рэгулярна паведамлялі пра шматлікія праблемы, што перасьледуюць беларускіх гастарбайтэраў за мяжой, асабліва тых, што накіроўваюцца ў пошуках заробку ў Расею. Новыя факты сьведчаць пра тое, што беларусы здольныя падманвацца, але й самі падмануць каго хочаш.

**СП**

## СЬЦІСЛА

### Рубель таньнее проці эўра

На працягу мінулага тыдня прапанова даляраў ЗША зьнізілася да $62 млн, попыт таксама паменшыўся і склаў $88,9 млн, паведамляе эканамічны тыднёвік «Белорусы и рынок». Курсы эўра і расейскага рубля ў адносінах да беларускага рубля вырасьлі на 0,72 і 0,42% адпаведна. За верасень адносна эўра нацыянальная валюта патаньнела на 3,92%, у адносінах да расейскага рубля — на 2,81%, адносна даляра ЗША — на 0,09%.

### Сідорскі сустрэўся з прадстаўнікамі «Ўнікрэдыт», «Крэдытанштальт» і ММБ

Банк UniCredit крэдытуе рэканструкцыю «Магілёўхімвалакно». Разьвіцьцю адносінаў з Групай UniCredit будзе садзейнічаць праца адкрытага ў Менску прадстаўніцтва Міжнароднага Маскоўскага Банку, які ўваходзіць у Групу UniCredit.

### Зьніжаецца стаўка рэфінансаваньня

З 1 кастрычніка стаўка рэфінансаваньня Нацбанку зьніжаная яшчэ на 0,25% да 10 працэнтаў гадавых.

### «Беларусьфільм» забудуюць літоўцы

Літоўская кампанія «Ханэр» выступіць у ролі забудоўніка новага офісу кінастудыі «Беларусьфільм» і жылых дамоў на тэрыторыі кінастудыі.

**СП; Радыё Рацыя, «Белорусы и рынок», БЕЛТА**

# Збор сродкаў на крыж па Сысу

Помнік на магіле Анатоля Сыса да трэцяе гадавіны сьмерці паэта зьбіраецца паставіць скульптар **Гэнік Лойка**. Камень ужо замоўлены, але на выраб помніка бракуе грошай.

«Я добра ведаў Анатоля, ён лічыў мяне сябрам, — кажа скульптар. — Мы былі знаёмыя з тых часоў, калі ён быў у «Тутэйшых», а я — у «Талацэ». У мяне ёсьць скульптура, якую я зрабіў тады для «Тутэйшых»: «Вянок маладым беларускім паэтам», цяпер яна захоўваецца ў музэі Багдановіча». І самому Сысу Гэнік Лойка некалі падарыў скульптуру «Страцім-лебедзь»: «Памятаеце ягоны верш:

А ты, Страцім, адзін
у эвангельскім небе Радзімы...
Ты ляці. Не глядзі,
ты ж прывык да азёр у ільдзінах».

Гэнік Лойка ўжо ствараў помнікі па дзеячах культуры. Напрыклад, па Міхасю Стральцову, Міхалу Дубянецкаму. Ягоны помнік па Сысу — стылізаваны крыж з барэльефам паэта ў цэнтры. Зьверху справа ў цярновым гнязьдзе прымасьцілася птушка, што сымбалізуе сабой «салаўінае сэрца» Беларусі. У ніжняй частцы крыжа — надпіс «Сыс Анатоль» з пазнакай году нараджэньня і сьмерці паэта.

Апроч Лойкі, у конкурсе, зладжаным аргкамітэтам па ўшанаваньні памяці паэта, бралі ўдзел скульптары Алесь Шатэрнік, Леў і Сяргей Гумілеўскія.

«Помнік будзе з чорнага граніту (габро-дыябазу), вагою недзе 800 кг. Камень ужо замоўлены на заводзе «Белгран», што ў менскай Дражні. Спачатку яго мусяць разрэзаць, і мы перавязем яго да мяне ў майстэрню, — кажа спадар Лойка. — Менавіта на аплату паслуг заводу і транспарціроўку патрэбныя грошы — усяго паўтара мільёна рублёў. Потым пачнецца ўжо менавіта мая праца».

Паводле словаў сябра аргкамітэту, паэта Эдуарда Акуліна, усталяваньне і адкрыцьцё помніку плянуецца да трэцяй гадавіны з дня сьмерці Анатоля Сыса — у траўні 2008 г. у вёсцы Гарошкаў.

**Наталка Бабіна**




**Сродкі на на выраб і ўсталяваньне помніка Сысу можна перадаць, зьвярнуўшыся праз т.: (017) 284–44–04, 768–56–14 (Эдуард), (029) 955–92–04 (Гэнік).**

# Значыць, гэта трэба

Калі адныя людзі арганізуюць літаратурныя фэстывалі, а другія на іх прыходзяць — такі гэта трэба і адным, і другім. Заля бібліятэкі імя Пушкіна ў Менску, дзе праходзіла адкрыцьцё міжнароднага (беларуска-ўкраінска-расейскага) фэстывалю «Парадак слоў» была запоўненая цалкам, і магія словаў выразна адбівалася як на тварах паэтаў, што выступалі, так і на тварах гледачоў. Што такое паэзія — боль, бой, жаль, жар паводле Галубовіча — ці нешта іншае, кожны вырашае сам. Важна, што падобныя фэстывалі даюць такую магчымасьць — параўнаць ды вырашыць. Найбольш цёпла, падалося, публіка вітала знаёмых: Андрэя Хадановіча, Марыйку Мартысевіч, Адама Глёбуса, Джэцці, Віктара Жыбуля.

**НБ**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Данчык зноў пачаў сьпяваць

У размове з карэспандэнткай радыё «Свабода» Данчык прызнаўся, што не сьпяваў 8 гадоў. «Нідзе, нават у душы». Але з тры месяцы таму сьпявак кінуў паліць, і аднойчы песьня сама зьляцела з вуснаў. «Я ішоў на працу і раптам засьпяваў. Проста на вуліцы». На шчасьце, голас сьпевака застаўся моцным і гнуткім, хоць сам Данчык на гэта не спадзяваўся. І ў той жа дзень Данчык дастаў сваю старую гітару, памяняў сапсаваныя струны і цяпер з гадзіну сьпявае свае старыя і новыя песьні.

З сваім новым рэпэртуарам Данчык марыць зноў прыехаць у Беларусь.

# Усё ня так

Усё гэта — кепскі сон. Піша **Віталь Тарас**.

Некалі, вельмі даўно, калі я вучыўся ў старэйшых клясах сярэдняй школы, я перажыў свайго роду ўнутраны крызіс. На той час я ўжо ня толькі цікавіўся «палітыкай», але й дазваляў сабе ўплішчвацца ў размовы дарослых у бацькоўскім доме на палітычныя тэмы. Размовы былі пра савецкае ўварваньне ў Чэхаславаччыну, пра тупагаловае савецкае начальства, пра забароненую літаратуру і галоўліт (тагачасную афіцыйную цэнзуру), пра вайну на Блізкім Усходзе, якую бліскуча выйграў Ізраіль, пра дзяржаўны антысэмітызм, пра дысыдэнтаў — Сахарава, Сіняўскага, Даніэля, пра замоўчваньне сталінскіх рэпрэсіяў, пра звальненьні з ВНУ таленавітых беларускіх выкладчыкаў і шмат пра што яшчэ…

Нейкае шостае пачуцьцё падказвала, што раўзмаўляць на гэтыя тэмы ў школе, нават зь сябрамі, ня варта. Зрэшты, дваістае мысьленьне было тады (дый цяпер) досыць пашыранай і натуральнай зьявай. Але вось аднойчы да галавы прыйшла простая думка, ад якой мне адразу стала не па сабе. А што, падумаў я, калі ўсё, чаму нас вучаць у школе на ўроках грамадазнаўства і гісторыі, распавядаюць падчас «палітінфармацыі», пра што пішуць газэты, пра што паказваюць фільмы і перадачы па тэлебачаньні — калі ўсё гэта чыстая праўда? А тое, што перадаюць замежныя «галасы» — сапраўды варожая прапаганда, ахвярай якой зрабіліся мае бацькі і іхныя сябры?

Мы ж, насамрэч, такія вялікія, мы запускаем людзей у космас, мы будуем столькі дамоў і электрастанцыяў, асвойваем Сібір і Далёкі Ўсход…А камусьці гэта не падабаецца. Яны, буржуі, нас ненавідзяць і перашкаджаюць нам будаваць самы справядлівы ў сьвеце лад. Магчыма, такімі катэгорыямі, дакладней, савецкімі штампамі я не разважаў. Хутчэй за ўсё, гэта нельга нават назваць думкай. Я толькі паспрабаваў сабе ўявіць — а што, калі ўсё ня так, як мне падаецца, і мне стала вусьцішна.

Ня памятаю, наколькі хутка прайшоў у мяне той эмацыйны шок. Відаць, у падлетка ў пятнаццаць—шаснаццаць гадоў былі на той момант больш важныя праблемы, акрамя як сьветапоглядныя. Карэкцыя сьвядомасьці адбылася сама сабой, з узростам, пад уплывам рэчаіснасьці. Адным з ключавых момантаў сталеньня стаў лёс двух маіх аднаклясьнікаў. Мой блізкі таварыш Моня, надзвычай экспансіўны чарнявы хлопец, быў круглым выдатнікам. Пасьля школы паступіў у Менскі радыётэхнічны інстытут, скончыў яго з чырвоным дыплёмам. І патрапіў паводле разьмеркаваньня на газакампрэсарную станцыю недзе пад Арэнбургам, без усялякіх пэрспэктываў. Неўзабаве пасьля гэтага Моня зьехаў разам зь сям'ёй у Ізраіль, адтуль у ЗША. Нейкі час мы перапісваліся, але потым нітачка былога сяброўства неўпрыкмет абарвалася…

Другі мой аднаклясьнік — на прозьвішча Максімаў (мы ўсе яго звалі, натуральна, Максам) быў абсалютна сьветлы ва ўсіх сэнсах хлопец. Высокі, бялявы, прыгожы… Ён таксама вучыўся на выдатна, марыў паступіць у прэстыжную на той час Вышэйшую інжынэрнае зэнітна-ракетную вучэльню імя Баўмана ў Маскве. (ВІЗРУ). Ягоная мара ажыцьцявілася. Яшчэ ня скончыўшы яе, здаецца, ён паехаў на практыку на Байканур. (Пра ўсё гэта гаварылася напаўголасу, як пра страшэнную таямніцу. Ды праз трыццаць гадоў магу пра нешта ўспамінаць недакладна.) Падчас нейкага небясьпечнага экспэрымэнту, Макс атрымаў моцную дозу апраменьваньня і «згарэў» усяго за некалькі месяцаў. Пра гэта мы, яго аднаклясьнікі, даведаліся толькі на ягоным пахаваньні ў Менску, ад прыгнечаных горам бацькоў. Яму было дваццаць зь нечым. Да Чарнобылю заставалася гадоў дзесяць. А перад намі ляжала ў труне ахвяра «мірнага атаму» і асваеньня комасу. Пахаваньне прайшло ціха, без удзелу высокіх асобаў і ўшанаваньняў — ні з Масквы, ні адкульсьці яшчэ, наколькі я памятаю, з начальства ніхто не прыехаў.

Але ж адчуваньне (ці самаправерка): можа, ўсё зусім ня так, як здаецца — пачасту вяртаецца, як у кепскім сьне.

І вось я думаю — а што, калі я і мае бацькі, мае сябры глыбока і безнадзейна памыляемся? Усё ня так, як нам падаецца…

Вось кіраўнік дзяржавы, вясёлы і маладжавы, аточаны дзяржаўнымі мужамі, энэргічна ідзе ў поле, у заводзкі цэх, на будаўніцтва мэтро, ва ўнівэрсам, і трымае каласкі ў руках, і насустрач яму ідзе народ, глядзіць з замілаваньнем і надзеяй.

Вось ідуць манэўры «Шчыт Айчыны», страляюць гарматы, лятуць ракеты, «і танкі нашы быстры», бяжыць пяхота і чуваць магутнае «Ўра!» І вораг ўцягвае голаў у плечы і хаваецца ў сваёй нары, тхор!

Вось на «Дажынках» камбайнэры ў бліскучых гарнітурах, з абветранымі тварамі й магутнымі каркамі — хоць здымай у Галівудзе (што там тыя каўбоі!) — атрымліваюць з найвышэйшых рук імянныя гадзіньнікі. Яны іх заслужылі!

Вось інтэлігентны інспэктар ДАІ, бездакорна апрануты, спыняе цябе і, выконваючы свой дзяржаўны абавязак, правярае дакумэнты і бярэ пад казырок.

Вось магутнага целаскладу спэцназавец, увесь з галавы да ног у чорным, праваджае цябе суровым позіркам да павароту.

Вось дыктары БТ у строях ад Вэрсачэ і з лагоднымі ўсьмешкамі на вуснах, усе такія мілыя і сымпатычныя. І штатныя аналітыкі бліскаюць хітрым вокам, якое бачыць цябе і ўсю апазыцыю наскрозь.

І славуты журналіст зь люлькай у зубах мудра-іранічна тлумачыць, чаму так цяжка, але так цікава й

здарова жыць у нашай краіне і як будзе жыць яшчэ лепей.

І маладзёны з тварамі, размаляванымі чырвонай і зялёнай фарбамі, апранутыя ў фірмовыя майкі з надпісам БРСМ, такія шчасьлівыя, такія натхнёныя…

І цябе ахоплівае пачуцьцё непарыўнага адзінства з мэханізатарам і даяркай, з Ксеніяй Сітнік і палкоўнікам Падабедам, міністрам Радзьковым і падатковым інспэктарам, бамжом на чыгуначным вакзале і школьніцай-сцыкухай зь бляшанкай піва «Александрыя» у руках, з зубром у Белавескай пушчы і белым буслом над Палесьсем. Гэта ўсё маё!

І ты адчуваеш, што гэта шчасьце. Бо разам мы — сіла. І мы — за! Заўсёды за!

І становіцца так невыказна добра, такое моцнае пачуцьцё ўдзячнасьці ахоплівае, што робіцца вусьцішна…

Табе хочацца прачнуцца. Але ты раптам разумееш, што даўно ня сьпіш. І прачнуцца немагчыма, бо ніякай рэальнасьці няма. А ёсьць нейкая апраметная для жывых душаў, нейкая прастора, напоўненая шэрымі зданямі, сярод якіх пачуваесься непакліканым госьцем, часовым прывідам у чужым сьне.

Але наступае раніца і як бы сьмяротна ні хацелася спаць, трэба ўставаць, прыводзіць сябе да ладу, пачынаць звыклую працу. І начныя кашмары падаюцца ўжо нястрашнымі, нават забаўнымі. І адкульсьці, зь нейкай нябачнай радыёкропкі чуецца сьветлы матыў: « Радзіма, мая дарагая…»



PHOTO.BYMEDIA.NET

зьбяры «Кнігарню «Наша Ніва»




**Паветраны шар**: беларускае мужчынскае апавяданьне

У кнігу ўвайшлі найлепшыя мужчынскія апавяданьні 1991—2007 гадоў у выбарцы «Нашай Нівы».




**Жанчыны выходзяць з-пад кантролю:** Беларускае жаночае апавяданьне

У зборнік увайшлі творы найлепшых сучасных аўтарак: Тацьцяны Барысік, Евы Вежнавец, Марыі Роўды ды іншых.




**Бабілёнская бібліятэка:** Замежная літаратура ў перакладах «Нашай Нівы».

Эдгар Алан По, О. Генры, Яраслаў Гашак, Бруна Шульц, Альбэр Камю, Хорхэ Люіс Борхэс ды іншыя — на роднай мове

шукайце ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў

# Сьпікерам палаты прадстаўнікоў пастаўлены стары Папоў

Дэпутаты прагаласавалі за кандыдатуру, прапанаваную з Адміністрацыі прэзыдэнта.

За В. Папова — 94 дэпутаты, «супраць» — 13.

Вадзіму Папову, народжанаму ў Смаленскай вобласьці былому міністру сельскай гаспадаркі, на гэты момант споўнілася 67 гадоў. Самай адметнай рысай гэтага чыноўніка заўсёды была адсутнасьць усялякіх палітычных і эканамічных амбіцый.

А перад тым, у той самы дзень, мела месца найбольшае вальнадумства ў гісторыі палаты прадстаўнікоў. Аж 19 дэпутатаў прагаласавала супраць адстаўкі Канаплёва. «За» прагаласавала 88 дэпутатаў.


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Адметная рыса чыноўніка Вадзіма Папова — адсутнасьць палітычных і эканамічных амбіцый.**

Паводле рэглямэнту, дэпутаты галасавалі таемна, папяровымі бюлетэнямі.

Сам Уладзімер Канаплёў на пасяджэньні не прысутнічаў. Дэпутатам раздалі ягоную заяву, у якой ён спасылаецца на дрэнны стан здароўя.

**Мікола Бугай**

# Лябедзька з боем перадаў подпісы ў Палату


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Лідэр Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька з боем прарываўся ў палату прадстаўнікоў, каб перадаць сабраныя ў часе пікетаў 30 верасьня подпісы супраць адмены ільготаў. Першая спроба патрапіць у будынак скончылася бойкай зь міліцыянтамі ў цывільным. Потым лідэра АГП пусьцілі ў сярэдзіну. На разьвітаньне Лябедзька пакінуў запіс у кнізе скаргаў. — Ул. інф.**

# Дзякуй

**Мікалаю К., Віктару С., Вользе Ш.** з Ваўкавыску.

**Ніне А.** зь Бераставіцкага раёну.

**Івану К.** зь Бярозаўскага раёну.

**В.Н.** зь Лепельскага раёну.

**Ігару Б.** з Воршы.

**Аляксандру П.** з Глыбоцкага раёну.

**Валянціне М.** з Навагрудзкага раёну.

**Валеру Ю.** з Салігорску.

**Зоі Д.** з Бараўлянаў.

**В.Г.** з Смалявічаў.

**Аркадзю К.** з Івацэвічаў.

**Вадзіму Б.** зь Сьветлагорску.

**В.А., С.А.** з Магілёва.

**Сяргею Т.** зь Лідзкага раёну.

**Натальлі І.** з Пухавіцкага раёну.

**Паўлу Ж., Аўгіньні К., Пятру С., Сяргею С.** зь Віцебску.

**Аляксандру П., Алегу Р., Вячаславу Р.** з Наваполацку.

**Сяргею К.** зь Сеньненьскага раёну.

**Мікалаю К.** з Чэрвеньскага раёну.

**Аляксандру К., Аркадзю Ж., Зьмітру М., Сяргею Д., А.К., Антону Д., Ірыне Д., Івану Р., Уладзімеру В.** з Горадні.

**Алегу П., Івану М.** з Маладэчна.

**Сяргею Т.** зь Лідзкага раёну.

**Язэпу Дз., Юліі Е.** з Гарадзенскага раёну.

**Лідзіі А., Сяргею С., Алесю Б., Віктару Г.** з Баранавічаў.

**Віталю А.** са Слуцку.

**Андрэю Г.** зь Ліды.

**Сяргею А.** з Клімавічаў.

**Язэпу Д., Пятру Д.** зь Сьвіслацкага раёну.

**Паўлу Л.** з Хойніцкага раёну.

**Зьмітру Ж., Сьцяпану Г., Уладзімеру Д., Зьмітру П., Анатолю С.** зь Менскага раёну.

**Ніне Б.** з Астравецкага раёну.

**Міхаілу Б., Уладзімеру С., Сяргею І., Васілю К., Генадзю Л., Кастусю Ж., А.Б., Сяргею П., Мікалаю Х., Ігару П., Зьмітру П.** з Гомелю.

**Тамары К.** з Жодзіна.

**Станіславу С.** са Жлобіну.

**Івану Ю., Юр'ю Б.** з Бабруйску.

**Сьцяпану А.** з Асіповіцкага раёну.

**В.Б., Надзеі І., Ліліі Б., Паўлу П., Т.П., Анатолю А., Сяргею Г., Барысу А., Валеру І., Уладзімеру К., Паўлу Б., І.Л., Тацяне Ц., Валеру Ш., Міхаілу Л., Тацяне К., Аляксандру Б., В.П., Мікалаю К., Ільлі П., Марыі М., Радзіму Г., Віктару Б., Сьвятлане К., Аляксандру М., А.В., Станіславу Ш., Андрэю Т., Ігару Х., Вячаславу Г., Сяргею Г., Генадзю Ш., Людміле І., Анатолю В., Т.П., Міхаілу Б., С.Т., Анатолю А., Аляксандру К., Валеру Г., Андрэю С., Алегу М., Юр'ю М., Алене М., Н.М., К.Ж., Віктару М., Інэсе Н., А.С., Ф.К., Уладзімеру Ц., В.В., С.К., В.М., У.Дж., В.Я., А.М., Сяргею А., Леаніду Р., Г.С., Валеру В., Васілю З., Алегу А., А.Ч., Уладзімеру М., В.К., Сьвятлане Б., Георгію П., Юр'ю Ч., П.Дз., Усеваладу С., Эдварду К., А.С., Аляксандру С., Натальлі Л., Раісе К., Алене К., Л.Н., Г.Ж., Анатолю К., Тацяне Ф., І.В., Юр'ю М., Адаму Р., Т.К., М.Ж., Л.Т., М.Б., Уладзімеру Л., Фёдару П., Мікалаю Ш., Валеру М., П.К., У.Н., Ізмаілу А., Валеру Г., Э.К., Любаміру Р., Альберту С., Зьмітру Р., Тацяне В., Р.Р., А.К., Ірыне Л., А.М., Сьвятлане Ц., Аляксандру Ф., З.А., Іне К., Мікалаю У., Т.М., Раісе Б., Уладзімеру Р., Н.Б., Надзеі П., Уладзімеру С., Анатолю П., Андрэю Х., Андрэю М., Л.Л., Ільясу Х., Галіне Т., Л.Т., Юр'ю Я.** зь Менску.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перакaзу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

Па пытаньнях атрымання газэты пытайцеся Рамана.

# Лукашанец: Трэба паставіць кропку. Вячорка: Праект недапрацаваны і нясвоечасовы


СЯМЁН ПЕЧАНКО

Аляксандар Лукашанец.

Дырэктар інстытуту мовазнаўства імя Якуба Коласа ўзяў удзел у арганізаваным Таварыствам беларускай мовы круглым стале, прысьвечаным абмеркаваньню Праекту Закону «Аб правілах беларускай артаграфіі і пунктуацыі».

«На пачатку 90-х мы вызвалілі джына з пляшкі, якога не загналі назад дагэтуль. У справе ўнармаваньня правапісу раз і назаўсёды трэба паставіць кропку», — так патлумачыў дырэктар інстытуту мовазнаўства імя Якуба Коласа Аляксандар Лукашанец патрэбу ў новай рэдакцыі правапісу.

Пры гэтым ён зазначыў, што на сустрэчу прыйшлі людзі, якіх яднае адна мэта, але якія маюць розныя падыходы да яе ўвасабленьня. На думку сп.Лукашанца, новая рэдакцыя правапісу не нясе шкоды беларускай пісьмовай традыцыі, будуць зробленыя праўкі, запатрабаваныя зьменамі часу.

«Трэба канчаткова спыніць артаграфічны разнабой у літаратурнай мове,


СЯМЁН ПЕЧАНКО

асабліва гэта датычыць навучальнага працэсу», — падкрэсьліў А. Лукашанец.

«Нас яднае значна больш, чым разьядноўвае», — аналягічна пачаў свой выступ адзін з аўтараў «Беларускага клясычнага правапісу» Вінцук Вячорка.

Аднак ён падкрэсьліў: «Замацоўваючы новую рэдакцыю правапісу заканадаўча, мы моцна рызыкуем, бо на сёньня ён недапрацаваны і нясвоечасовы».

Паводле словаў В.Вячоркі, зусім не адраджэньне «тарашкевіцы» стала тым «джынам», што перашкаджае далейшаму разьвіцьцю мовы.

«Праблема ў недасканаласьці акурат унармаванага ў 30-я гады правапісу, а да ўсяго гэтыя недасканаласьці скрозь прасочваюцца ў новым правапісе, які хочуць замацаваць законам».

Удзельнікі круглага стала, сярод якіх былі Зьміцер Саўка, Вераніка Курцова, Сяргей Запрудзкі, Станіслаў Суднік, Людміла Дзіцэвіч, Ігар Клімаў, Уладзімер Кулiковіч ды інш., адзначалі як пазытыўныя, так і адмоўныя моманты ў новым правапісе, аднак супольнай думкай стала тое, што прыняцьце яго пакуль не насьпела, а зацьвярджэньне яго ў парлямэнце супярэчыць сусьветным нормам. Прагучалі таксама засьцярогі, што гэтае нават ўвядзеньне нясе пагрозу незалежным СМІ, што паслугоўваюцца неафіцыйным правапісам. Праўнік Юры Чавусаў акцэнтаваў увагу менавіта на абавязковасьці выкананьня кадыфікаванага правапісу і адказнасьці за яго парушэньне:


СЯМЁН ПЕЧАНКО

Вінцук Вячорка (пасярэдзіне).

«Узьнікае шмат пытаньняў, пачынаючы з унясеньня зьменаў у Адміністрацыйны кодэкс».

Сп.Чавусаў прапанаваў ініцыяваць парлямэнцкія слуханьні па праблеме правапісу з удзелам адмыслоўцаў, зазначыўшы, што нашы дэпутаты папросту некампэтэнтныя ў гэтай справе.

Па выніках круглага стала была агучаная прапанова В.Вячоркі патрабаваць адкласьці зацьвярджэньне новага правапісу ў форме закону да аднаўленьня рэальнага функцыянаваньня беларускай мовы ў дзяржаўнай сфэры. Таксама прапануецца апублікаваць Праект Закону ў дзяржаўных СМІ. Канчатковы варыянт рэзалюцыі круглага стала будзе падрыхтаваны да аўторка 3 кастрычніка.

**Сямён Печанко**

# Час абдымаць, і час ухіляцца ад абдымкаў

У працяг дыскусіі аб адзіным правапісе піша Віктар Адзіночанка.

У № 33 « Нашай Нівы» ад 6 верасьня гэтага году быў надрукаваны артыкул Сяргея Дубаўца «Ганс вялікі і Ганс малы», прысьвечаны новай рэдакцыі «Правілаў беларускай артаграфіі і пунктуацыі», падрыхтаванай Міністэрствам адукацыі РБ. Тэзіс, вынесены ў пачатак артыкулу: «Гаворка не ідзе пра адступніцтва або здраду клясычнаму правапісу як прынцыпу. Новыя правілы дадуць нам падставу гаварыць пра адну беларускую мову на постсавецкім этапе яе разьвіцьця. Хоць новы правапіс, безумоўна, запатрабуе далейшага рэфармаваньня».

Клясычны правапіс — гэта «тарашкевіца», якая ў 1933 годзе была гвалтоўна заменена «наркамаўкай». Мадэрнізаваным варыянтам апошняй будуць новыя правілы. С. Дубавец лічыць, што з гэтымі правіламі трэба пагадзіцца ў імя справы нацыянальнага адзінства.

У пачатку адзначу, што я цудоўна ведаю, хто такі Сяргей Дубавец і што ён зрабіў для беларускай культуры. Таму я буду абмяркоўваць праблемы, узьнятыя чалавекам, якога, па-першае, лічу аднадумцам і, па-другое, адчуваю да яго павагу. Пішу гэта ў самым пачатку менавіта з той нагоды, што з асноўнымі палажэньнямі артыкула катэгарычна ня згодны.

> Беларусь цяпер знаходзіцца ў пераходным стане: шмат што мяняецца да лепшага, шмат недарэчнасьцяў. На пераходзе няможна адмаўляцца ад арыенціраў.

Скажу адразу, што не зьяўляюся філёлягам, і таму не лічу сябе спэцыялістам у моўным аспэкце пытаньня. На мой погляд, «тарашкевіца» больш адпавядае гучаньню беларускай мовы, хаця сам я выкарыстоўваю тую беларускую мову, якой навучыўся [Сам гэты ліст напісаны школьным правапісам. — **Рэд.**]. У той сытуацыі, у якой мы знаходзімся, ня бачу ніякіх падставаў для канфлікту паміж носьбітамі розных варыянтаў беларускай мовы: «тарашкевіцы», «наркамаўкі» альбо той, што будзе ўведзена ў адпаведнасьці з новымі правіламі.

Пярэчаньні ў мяне выклікае аргумэнтацыя С. Дубаўца, якая зьвязана з пытаньнямі ня столькі філялёгіі, колькі сацыялёгіі. Крытыкуючы руплівцаў «тарашкевіцы», да якіх прылічвае і сябе, ён піша: «Сёньня мы ператварыліся ў сэкту, бо абралі для існаваньня паралельны сьвет. Замест таго, каб дамагацца зьменаў у афіцыйным правапісе, мы задаволіліся закрытым асяродкам сваіх выданьняў… Урэшце першапачатковая задача — думаць

**Віктар Адзіночанка**
дацэнт кафэдры філязофіі Гомельскага ўнівэрсытэту

**Працяг на старонцы 20.**

# Час абдымаць, і час ухіляцца ад абдымкаў

**Працяг са старонкі 19.**

маштабамі нацыі — была страчана на карысьць захаваньня прынцыпаў, якія даўно сталі кухоннымі».

І тут узьнікае пытаньне: а дзе ён, гэты «рэальны» сьвет, «паралельным» да якога зьяўляецца сьвет, што зьмяшчае ў сабе С. Дубаўца, а зь ім і шмат іншых асобаў? Няўжо гэта сьвет афіцыёзу? Няўжо БТ з «Савецкай Беларусіяй» — гэта органы, праз якія трансьлюецца рэчаіснасьць?

Відавочна, што тая сытуацыя, у якой цяпер знаходзяцца і беларуская мова, і беларускае грамадзтва не зьяўляецца нармальнай. Я ня буду закранаць пытаньне, ці гэты стан — аб'ектыўны вынік пераходнага пэрыяду ці прадукт неразважлівай дзейнасьці цяперашняга кіраўніцтва краіны. Хутчэй за ўсё, і тое і другое. Але галоўнае — з гэтымі ненармальнасьцямі не згаджацца.

Калі казаць пра заклік «думаць маштабамі нацыі», дык не зусім зразумела, што маецца на ўвазе. Што тут разумеецца пад «нацыяй»? Калі гэта насельніцтва Беларусі, дык яно вельмі разнароднае. Як сьведчаць сацыялягічныя дасьледаваньні, грамадзкая сьвядомасьць у Беларусі даволі супярэчлівая і ўтрымлівае самыя розныя кампанэнты. Апроч таго, любое нармальнае грамадзтва не зьяўляецца аднародным і складаецца з шэрагу разнаякасных групаў. Афіцыйная ідэалёгія старанна стварае вобраз адзінага беларускага народу, увасабленьнем інтарэсаў якога зьяўляецца цяперашняе кіраўніцтва краіны Ня трэба падтрымліваць гэты тэзіс, нават ускосна. Тыя жыхары Беларусі, якія ня згодны зь цяперашнім рэжымам, зьяўляюцца такімі ж прадстаўнікамі беларускага народу, як і тыя, хто з гэтым рэжымам згодны, а не «адмарозкамі» і «дэбіламі», як гэта імкнецца давесьці афіцыйная прапаганда. Дарэчы, сам я зьяўляюся сябрам Беларускага Хельсінкскага камітэту і ўжо амаль дзесяць гадоў у якасьці назіральніка прысутнічаю на ўсіх выбарах. Тое, што я там бачыў, выклікае ў мяне вялікія сумневы наконт адпаведнасьці рэчаіснасьці выказваньняў нашых уладаў пра тое, што яны прадстаўляюць безумоўную большасьць народу.

Калі Сяргей Дубавец піша: «Сёньняшняя Беларусь — постсавецкая і аўтарытарная — далёкая ад ідэалу, які нам мроіцца. Але пакуль мы не адчуем сябе яе часткай, нічога ня зьменіцца». Пытаньне: які сэнс у адчуваньні сябе часткай «постсавецкай і аўтарытарнай Беларусі»? Чаму б не адчуваць сябе часткай іншай Беларусі — свабоднай і дэмакратычнай, і паводзіць сябе як свабодны чалавек? Тым больш, што ня ўсё так адназначна. Гэта савецкі рэжым мог рэпрэсіўна навязаць рэчаіснасьць, цяперашні ж не настолькі моцны, шмат што ў ім хістаецца, і шмат што залежыць ад нас. Апроч таго, для значнай часткі людзей, нязгодных зь цяперашнім рэжымам, не стаіць пытаньне адчуваць ці не сябе часткай Беларусі. Яны тут рэальна жывуць і працуюць. Часткай чаго яны сябе павінны адчуваць? Таксама дадам, што, ідэал — гэта ня тое, што «мроіцца», гэта арыенцір для дзеяньняў. І калі ў чалавека такога арыенціру няма, ён ператвараецца ў беспрынцыпную істоту.

Скажу таксама пра пытаньні тактыкі. Праект новай рэдакцыі «Правілаў беларускай артаграфіі і пунктуацыі» падрыхтавала Міністэрствам адукацыі. І гэта менавіта ягонае дзіця. Навошта гэтыя правілы ў той ці іншай форме падтрымліваць, калі сам Сяргей Дубавец, піша, што гэта — «мадэрнізаваная «наркамаўка»? Цяперашняе Міністэрства адукацыі пасьлядоўна прытрымліваецца сваёй уласнай лёгікі. У тым жа нумары «Нашай Нівы» ад 6 верасьня Лявон Баршчэўскі піша пра новыя праграмы зь беларускай літаратуры, зь якіх выкінутыя вызначальныя творы Купалы, Быкава і Шамякіна.

На заключэньне хачу паўтарыць свой асноўны тэзіс: Беларусь цяпер знаходзіцца ў пераходным стане, шмат што мяняецца да лепшага, шмат недарэчнасьцяў. Ня трэба з усім згаджацца ў імя нейкага мітычнага адзінства невядома з кім. Як сказана ў Бібліі: «Час абдымаць, і час ухіляцца ад абдымкаў» (Экл. 3, 5).


Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

Год други Вильня 23 (6) наябра 1907 г. № 34.

...эна з перасылкою и дастаукою ...хаты: на 1 г. — ...р., на 6 мес. — ...р. 50 кап., на ...м. — 75 к., на 1 ...с. — 25 к. Без ...стаукы и перасылки: на 1 г. — ...40 к., на 6 м. — ...р. 20 к., на 3 ...с. — 60 к., на 1 ...с. — 20 к. За граніцаю: на 1 г. — ...р., на 6 мес. — ...р., на 3 мес. — ...р. Перамена ...рэсу — 20 кап.

# Наша Нива

Першая Беларуская Газэта з Рысунками

Выходзиць раз у тыдзень рускими и польскими литэрами.

Падписка прынимаецца и прадаюцца атдзельные нумэры газэты 1) У Канц. „Нашай Нивы" — Завальная вулица дом № 30, 2) У Книгарни „Знание" — Георгиеўски проспэкт дом № 14. 3) У Книгарни Литоўской М. Пясэцкой — Шлапэлис, Доминиканская вулица дом № 13.

Адрэс рэдакціи и администраціи: Вильня, Завальная вулица, дом № 30.

...ъвулення прынимаюцца на паследней страницы па 20 кап. за линейку малыми литэрами. Рукаписы и корэспондэнции, ...сланные у рэдакцию, мусяць быць чытатэльна написаны з праудзивою фамильею и адрэсом таго, хто не прысылае. ...жна также надписаць проўвищэ разом з фамильею, хто незахочэ, каб была надрукована праудзивая фамилия. Адрэс и фамилия тольки для ведама рэдакции.

## МАЁ ЖЫЦЦЕ.

Маё жыцце—адно горэ,
Што лятае меж людзей.
Ўсюды пуста, ўсюды гола...
Слёзы коцяцца з вачэй.

Хлеба мала, грошай трэба...
И клапоты и нуда;
Стогнеш, гледзячы на неба,
Шлеш жадания ўсе туда.

Там, ў далёким, вечным неби,
Так спакойна, весяло!
Паглядзиш, ўздыхнеш па хлеби...
На душы лягчэй, цяпло.

Так ўсё жыцце едзе далей,
Жыцце труднае маё;
Ўсе надзеи, ўсе жадания
Не найдуць дарог сабе.

Баутрук.

**У розныя часы беларускамоўныя карысталіся рознымі варыянтамі напісаньня.**

## Забароны клічуць да змаганьня

**Самасьведамасьць народу вызначае ягоную здольнасьць да супраціўленьня знадворнаму ціску, спробам асыміляцыі.**

Змаганьне існай улады супраць незалежніцкіх настрояў у нашай літаратуры тлумачыцца проста й дакладна. Цяперашняе кіраўніцтва, занадта падобнае да папярэдняга савецкага, баіцца ўзрастаньня хвалі нацыянальнага адраджэньня беларусаў, бо гэта натуральным чынам прывядзе да дэмакратычнай рэвалюцыі, рэвалюцыі ў галовах і сэрцах, калі кожны жыхар нашае краіны, нарэшце, сапраўды адчуе сваю прыналежнасьць да беларускай нацыі.

Паэтаў і празаікаў, паводле цяперашняй дзяржаўнай ідэалёгіі, увогуле не павінна цікавіць тэматыка слаўнае беларускае мінуўшчыны. Затое вітаюцца патасныя дыфірамбы ў гонар «народных вызваліцеляў» часоў Другой усясьветанай і «слушнасьці кірунку шляху разьвіцьця дзяржавы». Згодна з гэтымі вельмі простымі паняткамі і адбываецца падзел у лягеры беларускай літаратуры: на СПБ і СБП, на «ўхваленцаў» і «адраджэнцаў», на «арловых» і «чаргінцоў».

Калі маленькі беларус новага пакаленьня з упэўненасьцю кажа, што «Пушкін — гэта ня наш пісьменьнік. Ён — рускі», то гэта значыць, што сыстэма недапрацоўвае. Але забароны «Тутэйшых» Купалы, «Аблавы» Быкава, твораў Арлова і Гілевіча, наўрад ці спрацуюць. Яны толькі паджывяць цікаўнасьць да іхнае творчасьці. Калі іх забараняюць і выключаюць з праграмаў навучаньня, значыць, яны пішуць праўду, якую ад нас так старанна хаваюць.

Сябры «Моладзі БНФ», што ў кожны дзень ведаў выходзяць на менскія вуліцы ў абарону сваёй літаратуры й адукацыі пад пагрозай быць выключанымі з сваёй навучальнай установы, шчыра вераць у сваю перамогу над антыбеларускай палітыкай дзяржавы. Забароны выклікаюць толькі большую прагу змаганьня. Літаратурная гравітацыя цягне іх да шчырае праўды.

**Адам Птушка, Менск**

## Чужое сьвята

**8 верасьня беларусы адзначаюць Сьвята вайсковай славы.** Дык і на яго ўпаў нечы зайздросны позірк. Сьвята забаранілі, а замест яго зрабілі дзень Менску. Я ня быў супраць і такога гістарычнага сьвята, таму выбраўся на Нямігу. Дык што я там убачыў гістарычнага ці беларускага? Напачатку трапіў у Город ремёсел, але цяжка там было набыць ці хоць бы пабачыць што-нешта датычнае названага сьвята. Наагул не было нацыянальнай сымболікі, быццам усе 940 год мы жылі зь сярпом і кавадлам ды чырвона-зялёным сьцягам, а ня з рыцарскай Пагоняй. А вакол — п'яныя танцы пад расейскую папсу, сьвята піва, ярмарка мёду, які за падвойную цану прадавала маскоўская царква.

**Міхал Юрай, Менск**

## Акцыя каліноўцаў у Варшаве

**У Варшаве студэнты-каліноўцы зладзілі пэрформанс — тэатральную пастаноўку, у якой галоўную ролю адыгрывала «Прапаганда».** Чалавек у балахоне з газэтных нарэзак зь Вялікім тэлевізарам БТ на галаве хадзіў і наліваў усім напоі з імправізаванай чырвона-зялёнай бутэлькі. У пастаноўцы бралі ўдзел 30 чалавек

**Е.Дзьвінская**

## Удзячнасьць — яна ад адказнасьці

**У час чытаньня артыкула Янкі Запрудніка «Ўдзячнасьць — мастацтва душы, або Чаму беларусы ня ўмеюць дзякаваць?» («НН», №29) ува мне ўзьнялася хваля нязгоды з аўтарам.** Як можна абвінавачваць беларусаў, да якіх прылеплены цэтлік цярплівых, рахманых, што яны «ня ўмеюць дзякаваць»? Гэтага ня можа быць па вызначэньні. З большай падставай іх можна сароміць за грубасьць, нетактоўнасьць, бескультур'е, а больш за ўсё — за адкрытае хамства.

Аднак паказальна, што на такую непрывабную зьяву ў нашым жыцьці ўзяў увагу чалавек здалёк.

Адной з прычынаў няўдзячнасьці беларусаў Янка Запруднік лічыць іх беднасьць. Наўрад ці. Вось тыповая карцінка з прыгарадаў Менску. Да пешахода пад'яжджае іншамарка і яе ўладальнік (чалавек ня бедны) зьвяртаецца да пешахода: «Я извиняюсь (чаму? за што?). Как проехать на… (называецца населены пункт)» Атрымаўшы адказ, уладальнік іншамаркі адразу ж вешае на твар «цэглу» і моўчкі ад'яжджае. А дзе ж словы падзякі гэтага «культурнага» чалавека? І такіх выпадкаў дзясяткі.

За 70-гадовыя намаганьні зрабіць з розных народаў адзін — савецкі (па сутнасьці пазбавіць велізарную колькасьць людзей усяго свайго — роду, мовы, звычак, уласнасьці і г.д.) улады мелі такі-сякі плён. Вырасла некалькі пакаленьняў прыстасаванцаў. Якія думалі адно, гаварылі другое, а рабілі трэцяе. Якія прызнаюць толькі фізычную сілу. А віну за свае ўчынкі перакладаюць на каго заўгодна (суседа, супрацоўніка, аўтобус і г.д.). Заканамерна, што са стратай пачуцьця адказнасьці яны страцілі і іншыя чалавечыя якасьці, у тым ліку — пачуцьцё ўдзячнасьці.

Але нешта стрымлівала шматлікіх саўкоў. Нават самы дробны чыноўнік, прыроджаны хам, калі меў хоць нейкае дачыненьне да «Чырвонага дому», са скуры лез, каб выглядаць «культурным».

Насталі 90-я гады. І нашыя саўкі «разьняволіліся». Вось калі вылезьлі на паверхню ўсе іхныя якасьці і здольнасьці. Тады ж у літаратурных колах зьявілася тэорыя «рацыянальнага эгаізму» — своеасаблівае абгрунтаваньне саўковых паводзінаў.

Удзячнасьць, паводле Янкі Запрудніка, «пачуцьцё не прыроджанае… яго трэба культываваць». Дадам: ня толькі падвышаць сваю культуру, але і аднаўляць сумленьне і самасьвядомасьць.

**Генадзь Шэршань**

## Які сэнс працаваць

**«Мой бацька вучыў мяне, што пры жанчыне мужчына не павінен ні ў якім разе плакаць!» — гэтыя словы мне нядаўна давялося пачуць на чыгуначным вакзале ад аднаго зь мінакоў.** Майго суразмоўцу называлі Сьцяпанавічам. Мужчына сталага ўзросту падышоў ня проста так. Ён спазьніўся на цягнік. Дадому— больш за 50 км, а наступны цягнік толькі блізка да раніцы. На дадзены момант у чалавека зусім не было грошай.

Сьцяпанавіч працуе на чыгунцы электрыкам, і добра што хаця праезд на цягніках для супрацоўнікаў чыгункі бясплатны. Мужчына, саромеючыся, падышоў да незнаёмага, каб папрасіць грошай. Ён рэдка калі прасіў. Нават і ня ведаў, як гэта зрабіць так, каб не падаць бездапаможным. Было відаць, што чалавеку страшэнна няёмка. Мне не было шкада некалькіх тысячаў з кішэні. Але Сьцяпанавічу, акрамя таго, як перакусіць, хацелася й пагаварыць, выказаць абурэньне бездапаможнасьцю ў гэтай сытуацыі.

«Ведаеш, — казаў Сьцяпанавіч, — хіба так можа быць? Я адзін з найлепшых спэцыялістаў на чыгунцы. Але што мне тут плоцяць? Трыста тысячаў рублёў. Хіба гэтага дастаткова, каб забясьпечыць сябе? Ды нават і ня ў гэтым справа. Мой бацька-пэнсіянэр атрымлівае столькі ж. Які сэнс пасьля гэтага мне працаваць? Дачакаюся пэнсійнага ўзросту — ды гары яно гарам. Але вось толькі ўсё роўна вельмі крыўдна. Некалі я жыў і працаваў у абласным горадзе. Але «вялікі дзякуй» мясцовай уладзе, якая раптам высьветліла, што я незаконна пражываю амаль дваццаць гадоў у кватэры. Доўга не цырымоніліся. Выселілі з дому. Я нават да самога Васілевіча дайшоў, аббіваў парогі ўсіх магчымых установаў у краіне, але марна. Добра, што ў бацькі ў вёсцы быў дом, куды й перабраўся з сваёй сям'ёй.

Ну чаму такая несправядлівасьць у краіне? Калі думаю пра ўсё гэта, — працягвае Сьцяпанавіч, — душаць сьлёзы. Тады стараюся як мага хутчэй выбегчы ў садок на лавачку, якую адмыслова паставіў некалькі гадоў таму назад. Выходжу хутка, як магу. Нават калі позна ўжо. Жонка мая, бывае, пярэчыць, маўляў, куды сабраўся, сядзі дома! Нібыта ўцякаеш з хаты ад мяне невядома да каго і куды! Але я тады па-гаспадарску прыкрыкну на яе і бягу далей у садок. Бо сьлёзы цяжка трымаць у сабе доўга, яны, такая справа, так і выцякаюць з вачэй. А вось жонка ніколі не павінна пабачыць гэтага. Перад жанчынамі мужчына ніколі не павінен плакаць!»

**Сяргей Скулавец, tut.by**

## Ня веру

**Беларускім «Дажынкам» прысьвячаецца…**

Сёньня, калі ў афіцыйных СМІ шмат гаворыцца аб вялікім валавым намалоце збожжа каля 7 млн тонаў і амаль 2 млн тонаў у Менскай вобласьці, я дакладна ведаю, што да патасу і пустаслоўя дамешаная і пэўная доля хлусьні, якая ганьбуе сумленную і годную працу земляробаў. Проста сёньня ля ўлады ёсьць людзі, якія здольныя атрымаць вынік любой цаной, як гэта здарылася ў нашым раёне ў 2005 г., калі ў нас праводзіўся рэспубліканскі фэстываль «Дажынкі».

Перад раёнам была пастаўленая канкрэтная задача атрымаць 200 тыс. тонаў збожжа пры ўраджайнасьці 50 цэнтнэраў з аднаго гектару. І яна была выканана! Але якой цаной? З дапамогай яе вялікасьці прыпіскі ў указным парадку. Ва ўпраўленьне сельскай гаспадаркі выклікаліся кіраўнік і спэцыялісты і нам ставілася канкрэтная задача: колькі плошчаў сьпісаць і колькі зерня прыпісаць. Вось і выканалі. Пра тое, што гэта так, можна пераканацца, уважліва прачытаўшы раённую зводку аб уборцы ўраджаю. Так па стане на 27 жніўня 2005 г. было ўбрана 99% плошчаў, намалочана 183476 тонаў збожжа, ураджайнасьць — 50,4 ц/га, а ўжо на 30 жніўня 2005 г. убрана 98,8% плошчаў, то бок плошчы зьменшыліся, а намалот павялічыўся на 6237 тонаў і склаў 189713 тонаў, ураджайнасьць — 51ц/га! Адкуль? У актах на сьпісаньне збожжа сьпісана па 25% на ўсушку. І ўсім дарма прайшло. У наступныя гады раён ня здолеў пацьвердзіць высокага выніку, намалочваючы каля 150 тыс. т.

Згадваецца эпізод, зьвязаны з «дажынкамі», які адбыўся ў нашых суседзяў-капылянаў. Дзяржкантроль знайшоў прыпіску ў намалоце камбайнэраў — і ў іх аднялі аўтамабіль, уручаны на «Дажынках». Таму зь недаверам прыслухоўваюся да нашых гучных посьпехаў і выказваю спачуваньне ўсім, каму даводзіцца сутыкацца з такімі сытуацыямі.

**Даніла Гурыновіч**

# Пра Бэльгію

Не пасьпела Бэльгія апамятацца ад канфузу з гімнам, як новы прэм’ер паставіў яе перад новай праблемай. Флямандзкая хрысьціянска- дэмакратычная партыя, якую прадстаўляе прэм’ер, адмовілася ўваходзіць у кааліцыю з сваімі партнэрамі з Валоніі. Флямандцы ізноў патрабуюць фэдэрацыі, і праз гэта ня можа ўтварыцца новы бэльгійскі ўрад. Чаму ня могуць дамовіцца флямандцы й валоны? І што за краіна такая— Бэльгія?

Першымі тэрыторыю сучаснай Бэльгіі — гістарычныя герцагствы Фляндрыю і Брабант— аб’ядналі герцагі Бургундзскія-Валуа. Герцагства Бургундзкае, сталіцай якога быў Брусэль, зьяўлялася адной з найвялікшых дзяржаваў тагачаснае Эўропы і нашмат пераўзыходзіла Каралеўства Француское. Прадстаўнік герцага бургундзкага прысутнічаў на каранацыі Вітаўта Вялікага. Пасьля сьмерці апошняга з герцагаў, Карла Сьмелага, большасьць ягоных уладаньняў перайшла да Габсбурга. Імпэратар Карал Пяты, які нарадзіўся ў Бэльгіі, падарыў свае бургундзкія ўладаньні сыну—каралю Гішпаніі Піліпу. Новы ўладар прыйшоўся вольным правінцыям недаспадобы, і яны распачалі першую буржуазну рэвалюцыю. Гэтыя падзеі натхнялі Шылера, Гётэ, Бэтховэна, Аляксандра Дзюма, а ў нас— Уладзімера Караткевіча (верш «Прарок Босх»).

У выніку рэвалюцыі паўночная частка краіны ўтварыла Рэспубліку Злучаных Правінцыяў (сёньня Каралеўства Нідэрлянды, або папросту Галяндыя), паўднёвая засталася часткаю габсбургскае імпэрыі. Лёс гэтых, ужо розных, краінаў быў розным. Галяндыя стала «*ўзорнай капіталістычнай краінай»( Карл Маркс), «лябараторыяй Эўропы»( Арнольд Тойнбі).* Менавіта тады галяндцы зрабілі найвышэйшыя дасягненьні ў жывапісе (Рэмбрант), філязофіі (Сьпіноза), навуцы (вынаходніцтва тэлескопу, мікраскопу, геаграфічныя дасьледваньні). Галяндыя была прыкладам нечуванае свабоды сумленьня ў тагачаснай Эўропе. Там знаходзілі прытулак беларускія прыхільнікі Сымона Буднага, а таксама стварльнік нашых літараў Ільля Капіевіч.

Паўднёвыя правінцыі сталі прадметам барацьбы паміж Гішпаніяй, Францыяй, Аўстрыяй. На пачатку васямнаццатага стагодзьдзя яны знаходзіліся ў вартым жалю стане, там было ўсяго каля дзесяці пісьменных людзей. Канец васямнаццатага стагодзьдзя прынёс надзею. Пад уплывам францускае рэвалюцыі мясцовыя жыхары падняліся цяпер ужо супраць Вены і абвясьцілі сваю Бэльгійскую Рэспубліку (па назьве старажытнага кельцкага племені бэльгаў, якое калісьці тут жыло). Праўда, новая рэспубліка адразу апынулася ў залежнасьці ад Францыі. А Напалеон увогуле ліквідаваў усе прыкметы бэльгійскай самастойнасьці. Пасьля Напалеонаўскай паразы Бэльгія была перададзена Нідэрляндам. Але надзеі на гістарычныя сувязі ня спраўдзіліся. У 1830 годзе бэльгійцы зноў паўсталі і ўтварылі сваё каралеўства. Мікалай Першы хацеў дапамагчы свайму родзічу, галяндзкаму каралю, і паслаць свае войскі супраць бунтоўных бэльгаў. Але тут пачалося паўстаньне ў былым Вялікім Княстве Літоўскім. «Жандар Эўропы» апынуўся занятым, і бэльгійцы нарэшце атрымалі магчымасьць для самастойнага развіцьця. І скарысталіся ёю напоўніцу. На пачатку наступнага стагодзьдзя Бэльгія была ўжо імпэрыяй, чые валоданьні ў Афрыцы пераўзыходзілі Заходнюю Эўропу. Імёны Эміля Вэрхарна, Морыса Мэтэрлінка, Шарля дэ Кастэра (ягоную «Легенду пра Тыля Ўленшпігеля» пераклала на беларускую мову Леаніла Чарняўская, жонка Максіма Гарэцкага). Усе названыя аўтары— флямандцы, але пісалі яны на францускай «панскай» мове. Флямандзкая ж гаворка лічылася мужыцкаю. Флямандцы, канечне, былі незадаволеныя.

Таму, калі Гітлер рушыў на Бэлгію, краіна была захоплена, нягледзячы на мужнасьць каралеўскага войска (дарэчы, яно зрабіла ўражаньне на салдата Войска польскага Янку Брыля). Флямандцы ўбачылі ў прыходзе нямецкіх братоў шанец для сябе. І сапраўды, флямандзскай мове было дадзена зялёнае сьвятло. Флямандзкія нацыяналісты стварылі свой легіён СС.

Пасьля вайны Бэльгіі давялося перажыць свой эканамічны цуд, канец каляніяльнай імпэрыі. Памятаеце Патрыса Лумумбу, «закатаванага бэльгійскімі калянізатарамі»? Лумумба, дарэчы, не камуніст, а «волюнтэа», выхаванец бэльгійскіх школаў для афрыканцаў, і забілі яго не бэльгійцы, а чорныя, стваральнікі мясцовага «Прыднястроўя». Бэльгійцы хацелі пакінуць за сабой багатую вобласьць Катангу, дзеля чаго справакавалі яе аддзяленьне ад Конга. Сэпаратысты захапілі ў палон прэм’ер-міністра краіны і зьнішчылі яго. У 1999 годзе бэльгійскі ўрад прынёс сям’і Лумумба й народу Конга прабачэньні.

Галоўнай бэльгійскай праблемай, аднак, застаецца флямандзкае пытаньне. Некалькі разоў яно ўжо ставіла каралеўства на мяжу распаду. Арбітарам выступае кароль. На яго асноўная надзея й сёньня. Відаць, не памыліўся Бэранжэ, калі пісаў: *«Стаўце, бэльгійцы, сабе караля.»*

**Усяслаў Шатэрнік**



# У ценю Мулявіна




«Малітва» ім яшчэ не па зубох, а вось «Саўка ды Грышка» — якраз. Пра «Песьняроў» сёньня піша **Сяргей Будкін.**

Альбом «Распавядальная» займае ў дыскаграфіі дзяржаўных «Песьняроў» асаблівае месца. Бо ёсьць першым пасьля сыходу Мулявіна. Пасьля праслухоўваньня ён пакідае дваістае ўражаньне. З аднаго боку, «Песьняры» працягваюць трымаць марку, датычна вакальнага ды музычнага майстэрства. Прафэсіяналы суворыя! Нездарма некаторых музыкаў з гэтага складу запрашаў на працу яшчэ Мулявін. Сваё магчымасьці «Песьняры» дэманструюць ужо на самым пачатку кружэлкі, выконваючы акапэля «Сёньня Купала» з адсылкай да каронная песьняроўскай «Рэчанькі», якая зачаравала паўсьвету. Новы кіраўнік ансамблю Вячаслаў Шарапаў можа ў размове зьвязаць два словы па-беларуску, добра адчувае «песьняроўскі» фармат («Распавядальная» яго аўтарства магла б увайсьці ў «залаты» рэпэртуар «Песьняроў») ды яшчэ піша някепскія тэксты. Праўда, часам не стае яму гістарычных ведаў. Мулявін хоць і не вывучаў у школе беларускую мову і гісторыю, «Палянэз» Агінскага наўрад ці дазволіў бы сабе засьпяваць па-расейску. Ды яшчэ з запевам «Боже, храни мой край». Во быў скандал, каб «Выходила на берег Катюша» прагучала панямецку!

У новым альбоме «Песьняроў» хацелася пачуць *уласнае* ад гадаванцаў Мулявіна. Але сустракаем тут таго ж самага «Саўку ды Грышку», «Мой родны кут» ды «Зачараваную». Пяюць адзін у адзін, хіба аранжароўкі сьвяжэйшыя. Можна пачуць і цікавыя прыпадабненьні старым «Песьнярам», як «Ганна» на Якуба Коласа. Нічога прынцыпова новага ў «песьняроўскі» даробак музыкі ня ўносяць, нібыта баючыся датыкнуцца да нечага непарушнага. Гэтая праца слушна называецца «Распавядальная», бо да споведзі перад слухачом яны не гатовыя. Мулявінская «Малітва» ім яшчэ не па зубох, а вось «Саўка ды Грышка» — якраз.

Сёньняшнія «Песьняры» пакліканыя выконваць перадусім настальгічную функцыю. Іх песьні ідуць на «ўра» перад публікай, якая памятае чэргі па «песьняроўскія» кружэлкі ў музычных крамах. Для тых, хто пераняў у часы маладосьці «мулявінскую» моду. Для тых, хто з дапамогай гэтых песень прыйшоў да беларускай мовы. Гэтым удзельнікам ансамблю дужа няпроста: з аднаго боку на іх ціснe амаль 40-гадовы цяжар «Песьняроў», з другога — дзяржаўная прыналежнасьць. «Калі са мной не працягнуць кантракт, сваіх «Песьняроў» ствараць ня буду», — заявіў на прэзэнтацыі альбому Вячаслаў Шарапаў. Амбітных самастойных асобаў у сёньняшнім БДА сапраўды няма, таму чарговы раскол «Песьняроў» дакладна не адбудзецца.

Тым ня менш «Песьняры» зацікавілі сваімі далейшымі абяцаньнямі. Цяпер яны працуюць над песьнямі на раньнія вершы Янкі Купалы, хочуць пакласьці на музыку творы беларускіх паэтаў XIX ст. Ёсьць спадзяваньне, што з гэтымі працамі «Песьняры» з трыб'ют-ансамблю стануць самастойным калектывам.

## ДЫСКАГРАФІЯ

# Сузор'е




Песьня пра зубра. 2007

У гісторыі айчыннага року ёсьць як мінімум два недаацэненыя творы, якія ўражваюць сваёй маштабнасьцю, але з розных прычынаў так і не дайшлі да масавага слухача. Рок-опэру «Гусьляр», зробленую «Песьнярамі» 20 год таму, маюць хіба зацятыя прыхільнікі ансамблю. У Беларусі з тых часоў яна не перавыдалася, дый самі «Песьняры» на яе забыліся па хуткім часе — да такіх маштабных твораў іх аўдыторыя не была падрыхтаваная. Другі такі твор — «Песьня пра зубра», за якую ўзяўся на пачатку 80-х яшчэ адзін культавы ВІА — «Сузор'е».

Імя Міколы Гусоўскага тады толькі вярталася з занядбаньня, і ідэя зрабіць рок-опэру паводле ягонага твору — даволі сьмелы крок для таго часу. Натуральна, што падтрымкі ў чыноўнікаў музыкі не знайшлі. «Сузор'е» тады працавала пры філярмоніі ў якасьці такіх беларускіх «Землян». Але што робіць ім гонар — ідэі не пакінулі і між «чосавымі» турамі па Саюзе працавалі над «Зубром».

З тых часоў захаваўся 20-хвілінны запіс, які афіцыйна так і не пабачыў сьвет. У 1983 г. Мінкульт загадаў расфармаваць гурт, а яго ўдзельнікі цягам году разьбегліся хто куды. Спробы вяртаньня былі ўжо ў наш час, але каго сёньня зьдзівіш песьнямі ў стылі «Машины времени»? Але новы запіс «Песьні пра зубра» можа зацікавіць нават далёкіх ад 80-х. Наўрад хто з сучасных беларускіх музыкаў здольны на стварэньне нечага падобнага.

Музыкі сабраліся разам у студыі, каб давесьці да ладу сваю ідэю 16-гадовай даўніны. Лібрэта дапісалі, усе партыі перайгралі ды перасьпявалі. Гэты дыск варта паслухаць хоць дзеля трэку «Паляваньне», зробленым хай сабе і ня ў модным рэчышчы арт-року, але з справядлівай прэтэнзіяй на вечнасьць. Тут сьпявае Нэлі Дзянісава — па-сутнасьці першая айчынная «рок-князёўна». Цікавы і наступны трэк — «Панна Марыя» з вакалам Паўла Харэвіча: дзіва бярэ, як стасуецца такі сьветлы тэкст з хард-рокам. Менш за ўсё падчас працы над «Зубром» музыкі зважалі на музычную моду. Гучаньне дыску досыць архаічнае, але «Сузор'е» бярэ іншым. А да ўсяго, хто сказаў, што старое віно нясмачнае?


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## На Беларусь насоўваецца хваля дажджоў

Бабіна лета скончылася. Яно пабіла шэраг тэмпэратурных рэкордаў, высьпеліла антонаўкі і каштэлі, укрыла лясы баравікамі.

Хваля дажджоў насунулася на Беларусь з-над Балтыкі і Атлянтыкі. Горадню яны накрыюць ад аўторкавага падвячорка, Берасьце, Менск і Віцебск — ад ранку серады, а да Гомеля дойдуць па паўдні серады.

Першая хваля ападкаў будзе самая інтэнсіўная.

Дажджы зь перапынкамі будуць ліць аж да пятніцы, пасьля чаго, згодна з прагнозамі сыноптыкаў, на некалькі дзён усталюецца яснае, хоць ужо і халаднейшае надвор’е, сапраўдная залатая восень, празрыстая і шчымлівая.

## Сам сябе застрэліў на паляваньні

Здарэньне адбылося ля вёскі Кашалі Пухавіцкага раёну каля трох гадзін ночы. Сталічны жыхар, рабочы аднаго з унітарных прадпрыемстваў, спатыкнуўся і пры падзеньні нанёс сабе сьмяротную рану ў шыю зь незарэгістраванага паляўнічага ружжа. Насьцярожвае, што ўсё здарылася ўначы.

## Берасьцейшчына сее каноплі

У Бярозаўскім раёне зьнішчана каля 300 кг канопляў. Плянтацыі былі выяўленыя на пустках непадалёк ад вёсак Яленава і Асекі. За гэты год супрацоўнікі міліцыі Берасьцейшчыны выявілі і зьнішчылі больш за тону канопляў у Брэсцкім, Кобрынскім, Камянецкім, Ганцавіцкім і Бярозаўскім раёнах. Самая вялікая плянтацыя была непадалёк ад вёскі Быстрыца Ганцавіцкага раёна — больш за 500 кг канопляў.

## Беларусь асвоіць Антарктыку

У Беларусі плянуецца стварыць Рэспубліканскі цэнтар палярных дасьледаваньняў. Першапачаткова ў Цэнтры будзе працаваць пяць чалавек.

## Вялікая белая чапля — птушка 2008 году

Вялікая белая чапля (Egretta alba) абраная Цэнтральным Саветам АПБ (ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны») птушкай 2008 г. Сёлета Нацбанк прыняў рашэньне штогод выпускаць манэту «Птушка году ў Беларусі». Вялікая белая чапля — адзін зь дзевяці відаў чапляў, якія сустракаюцца ў краіне. Раней у Беларусі мела статус «рэгулярна залётны від». З 1990-х гадоў пачала адзначацца на гнезданьні.

## У Беларусі зьявіцца музэй рыбы

Ён будзе створаны на базе заасаду Магілёўскага дзяржаўнага прафесійнага агралесатэхнічнага каледжа імя К.Арлоўскага. Акрамя стварэньня музэя, плянуецца правядзеньне ў заасад чыгункі і арганізацыя рэгулярных прагулачных рэйсаў па Дняпры. На рэалізацыю праектаў спатрэбіцца каля Br4 млрд.

## Дванаццаты падпольны бровар за месяц

Тры тысячы літраў брагі і падпольны міні-завод па вытворчасці самагону зьнішчаны ў Бярозаўскім раёне. Вытворчасць была знойдзена супрацоўнікамі міліцыі ў лясным масіве непадалёк ад вёскі Вільянава. Акрамя абсталявання і падрыхтаванай для перапрацоўкі брагі, апэратыўнікі знайшлі 30 літраў гатовай прадукцыі. Гэта ўжо 12-ы падпольны бровар, выяўлены на тэрыторыі вобласьці з пачатку верасьня.

## Нараўлянскае баржомі

У Нараўлянскім раёне маецца падземельнае возера мінэральнай вады, якая па сваіх уласьцівасьцях нагадвае славутую грузінскую баржомі. Дэпартамэнту па геалёгіі даручана вывучыць усе вартасьці праекту яе здабычы.

## «Ва Ўзьвіжаньня пару гадзюкі і вужакі хаваюцца ў нару»

27 верасьня праваслаўная царква адзначыла адно з найбольшых сьвятаў — Узьвіжаньне Сьвятога і Жыватворнага Крыжа Гасподняга. Сьвяткаваньне Ўзьвіжаньня запачаткаванае царквой пасьля таго, як рымская імпэратрыца Алена зьдзейсьніла паломніцтва ў Ерузалім у пошуках крыжа на якім быў расьпяты Ісус. Алена насамрэч знайшла крыж.

Беларусы лічаць, што ў гэты дзень у лясох усе зьмеі зьбіраюцца разам, каб адправіцца на зімовы сон, таму 27 верасьня людзі не рызыкавалі хадзіць у лес. Узьвіжаньне — першы дзень пачатку збору журавінаў. Таксама гэты дзень лічыцца канчатковым разьвітаньне зь летам.

## Менскі стадыён «Дынама» накрыюць

Стадыён «Дынама» ў Менску пасьля рэканструкцыі стане крытым, паведаміў дырэктар КУП «Упраўленьне капітальнага будаўніцтва Менгарвыканкаму» Андрэй Галь. Ён таксама выказаў меркаваньне, што рэчавы рынак на стадыёне зачыніцца.

## Дзіцячае «Эўрабачаньне-2009» можа прайсьці ў Віцебску

Міжнародны дзіцячы конкурс песні «Эўрабачанне-2009» можа прайсьці на сцэне Летняга амфітэатра ў Віцебску. Беларусь ужо падала заяўку на правядзеньне гэтага міжнароднага форуму.

## Італьянскія чыноўнікі перасядуць у малалітражкі

З урадавых лімузынаў італьянскія міністры неўзабаве перасядуць на меншыя аўтамабілі. Гэта адзін з пунктаў праграмы эканоміі, якая стараньнямі прэм’ера Рамана Продзі была ўключаная ў бюджэт на наступны год. З новага году сярэдні аб’ём рухавіка ўрадавага аўтамабіля ня можа перавышаць 1600 куб.см.

**Мікола Бугай, Зьміцер Панкавец, Дзьмітры Вінчэўскі; Звязда, БелаПАН, Народныя навіны Віцебска, Белта, Польскае радыё для замежжа**

# Сігневічы. Гісторыя адной вёскі

Ёсьць у Бярозаўскім раёне вёска Сігневічы. Вёска як вёска — адна з соцень такіх вёсачак па ўсёй Беларусі. Адно толькі вылучае яе з гэтага шэрагу — стары цагляны касьцёл ды драўляная пажарная вежа.

Вёска Сігневічы цэнтральная ў сельсавеце, але ж моладзі тут мала, асноўны кантынгент — людзі за 50 гадоў. У вёсцы большасьць каталікоў, таму на мясцовай мове адбітак пакінула і польская.

На фоне старых драўляных хатак яскрава вылучаюцца новенькія прэзыдэнцкія дамкі, заселеныя ў гэтым годзе маладымі сем'ямі. Таму ў школе на клясу ў сярэднім восем чалавек.

На пачатак жніўня, калі я завітаў у вёску, з навакольных палёў збожжа ўжо сабралі, засталіся толькі качулкі саломы, а паблізу кукурузнае поле, на якім мясцовыя мужыкі заўсёды могуць знайсьці закуску.

На жаль, у вёсцы Сігневічы няма аптэкі, таму па лекі бабулькам даводзіцца ганяць на ровары ў суседні Марывіль.

Затое ў Сігневічах знаходзіцца стары касьцёл у гонар сьвятой Дзевы Марыі, пабудаваны ў 1795 годзе. За сваю гісторыю касьцёл ня раз руйнавалі, апошні раз у гады Другой усясьветнай. Цяпер ён, адноўлены, ганарліва ўзвышае свае крыжы над старэнькімі хаткамі. На кожную імшу прыходзіць сто чалавек, на сьвяты — сто пяцьдзясят.


RADZIMA.ORG

Рамонт у касьцёле выконваюць мужчыны, асуджаныя на «хімію», усяго дзесяць чалавек. Жывуць яны ўсе разам у доме ксяндза Пятра. Таму і незвычайнай мне падалася сытуацыя, якую я назіраў падчас перапынку на абед: ксёндз ляжыць на канапе пад партрэтам Яна Паўла II, а вакол за сталом асуджаныя сёрбаюць суп і глядзяць тэлевізар. Проста ідылія.

А ня так даўно пад касьцёлам знайшлі падземныя хады, адзін зь якіх ідзе ў бок бальніцы, а іншыя пакуль невядома куды. Але ж ксёндз Пётар абяцаў абавязкова дазнацца.

Вясковае паветра зноў узрушыла мычаньне кароваў, і бабулькі выходзяць на падворак, каб сустрэць сваіх Зорак і Стрэлак. А тым часам, паблізу зь ціхім і згасаючым вясковым побытам, штодзённа шуміць сваім бесьперапынным аўтатранспартным жыцьцём «алімпійка» — шаша Берасьце—Менск.

**Павел Белавус**

# Беспрацоўе і заробкі: міты і легенды

Эўрастат надрукаваў чарговыя дадзеныя, што сьведчаць пра зьніжэньне ў Эўразьвязе ўзроўню беспрацоўя. Паводле інфармацыі эўрапейскай статыстычнай службы, у красавіку 2007 г. узровень беспрацоўя ў эканоміцы ЭЗ–27 і зоны эўра (ЭЗ–13) склаў 7,1%, альбо стаў на 0,9% ніжэйшы, чым у красавіку 2006 г. Самы нізкі ўзровень беспрацоўя зафіксаваны ў Нідэрляндах (3,3%) і Ірляндыі (4%), самы высокі — у Польшчы (11,2%) і Славакіі (10,5%).

Згодна з ацэнкай Эўрастату, агульная колькасьць беспрацоўных у Эўразьвязе — 16,7 млн. чалавек, альбо на 2 млн. меншая, чым год таму.

Беларускія ж статыстычныя крыніцы з задавальненьнем канстатуюць: афіцыйны ўзровень беспрацоўя ў краіне — каля 1%. Але аднаадасоткавае беспрацоўе — гэта, безумоўна, міт. Больш–менш рэальныя лічбы агучыў у мінулым годзе міністар працы і сацыяльнай абароны Ўладзімер Патупчык. У Беларусі колькасьць беспрацоўных складае 372 тыс. чалавек, што ў 6,6 разоў перавышае колькасьць грамадзян, якія знаходзяцца на ўліку ў органах дзяржаўнай службы занятасьці. Як паведаміў міністар, ацэнкавая колькасьць незанятага насельніцтва краіны складае 736 тыс. чалавек, зь якіх 372 тыс. можна разглядаць як патэнцыйную базу для павелічэньня колькасьці беспрацоўных. «Сюды ўваходзяць грамадзяне, якія шукаюць працу, імкнуцца да працаўладкаваньня, тыя, хто працуе без афармленьня працоўных адносінаў, у тым ліку па–за межамі краіны», — удакладніў ён. Да другой групы Ўладзімер Патупчык аднёс тых, хто не працуе, таму што можа сабе гэта дазволіць, ухіляецца ад працаўладкаваньня, а таксама асацыяльныя элементы. Ацэнкавая колькасьць другой групы, паводле ягоных зьвестак, — 364 тыс. чалавек. Прычым, як адзначыў міністар, афіцыйная статыстыка не валодае дакладнымі зьвесткамі, а лічба ў 736 тыс. атрымана паводле вынікаў выбаркавага сацыялягічнага апытаньня. Для высьвятленьня сапраўднай сытуацыі неабходна праводзіць спэцыяльныя дасьледаваньні на пастаяннай аснове.

На 1 студзеня 2007 году колькасьць насельніцтва ў рэспубліцы склала 9,714 мільёнаў чалавек, зь іх амаль 2,5 мільёнаў — пэнсіянэры. Калі выключыць іх, больш за паўтара мільёны непаўнагадовых, улічыць, што частка працоўных занятая няпоўны працоўны дзень, адсотак беспрацоўных сярод працаздольнага насельніцтва можа дайсьці і да адзнакі 10%.

18 чэрвеня Эўрастат надрукаваў дадзеныя, якія сьведчаць пра адрознасьць ва ўзроўні мінімальнай заработнай платы ў краінах Эўрапейскага Зьвязу. Паводле інфармацыі Эўрапейскай статыстычнай службы, у студзені 2007 г. 20 з 27 дзяржаваў–сябраў ЭЗ мелі нормы, што ўсталёўвалі мінімальны ўзровень заработнай платы. Самыя высокія мінімальныя заробкі выплочваюцца ў Люксэмбургу (1 570 эўра ў месяц), Ірляндыі (1 403 эўра), Злучаным Каралеўстве (1 361 эўра), Нідэрляндах (1 301 эўра), Бэльгіі (1 259 эўра) і Францыі (1 254 эўра). Самыя нізкія — у Баўгарыі (92 эўра ў месяц), Румыніі (114 эўра), Латвіі (172 эўра), Літве (174 эўра), Славакіі (217 эўра), Эстоніі (230 эўра) і Польшчы (246 эўра). Доля грамадзян, якія атрымліваць мінімальную заработную плату, таксама адрозьніваецца. Такіх людзей параўнаўча няшмат у Гішпаніі (0,8%), Мальце (1,5%), Славакіі (1,7%), Злучаным Каралеўстве (1,8%) і Чэскай Рэспубліцы (2%). У шэрагу краін іх больш за 10% насельніцтва: у Францыі (16,8%), Баўгарыі (16%), Латвіі (12%), Люксэмбургу (11%) і Літве (10,3%).

Для параўнаньня — мінімальны заробак у Беларусі — 179 050 рублёў, гэта 60 эўра.

Сярэдні заробак работнікаў Рэспублікі Беларусь (паводле зьвестак Міністэрства статыстыкі і аналізу) у жніўні 2007 году склала 737340 рублёў, гэта 246 эўра — як польская «мінімалка».

Пры гэтым 38,1% насельніцтва жывуць на суму, якая не перавышае 300 тыс. рублёў, то бок менш чым на 100 эўра ў месяц. Яшчэ 37,7% — на суму, якая не перавышае 167.

**На 1 студзеня 2007 году колькасьць насельніцтва ў рэспубліцы склала 9,714 млн чалавек, зь іх амаль 2,5 млн — пэнсіянэры. Калі выключыць іх, больш за паўтара мільёны непаўнагадовых, улічыць, што частка працоўных занятая няпоўны працоўны дзень, адсотак беспрацоўных сярод працаздольнага насельніцтва можа дайсьці і да адзнакі 10%.**

Дадзеная публікацыя падрыхтаваная пры спрыяньні Эўразьвязу і не абавязкова адлюстроўвае афіцыйны пункт гледжаньня ЭЗ.
Па дадатковую інфармацыю зьвяртайцеся на сайт www.delblr.ec.europa.eu

# Сучасныя праваслаўныя



Гэта сучасны праваслаўны манастыр з інтэрнэтам, камптарам, гарачай вадой і турыстамі-наведнікамі. І толькі тры мясцовыя жыхары: брат Фоташоп, брат Камень і брат Тутсі (першым двум мы прыдумалі мянушкі, Тутсі — гэта сабака).

Брат Фоташоп — фатограф у мінулым, які ў 30 гадоў з аднаго з рэпартажаў вярнуўся праваслаўных манахам. Цэлымі днямі ня вылазіць з-за кампутара, апрацоўваючы фатаздымкі. Брат Камень працаваў з намі і ўвесь час паўтараў, каб мы слухалі, пра што кажуць камяні.

У гэтае месца, на поўначы Францыі, я трапіў на фотасэмінар. Спачатку ідэя здавалася прывабнай: за 25 эўра за суткі, трохразовае харчаваньне, сапраўдная ізаляванасьць, і толькі адна ўмова — працаваць тры гадзіны ў дзень. На месцы ўсё апынулася інакш. Харчаваньне было фантастычным — за тыдзень ніводная страва (нават дэсэрт) ні разу не паўтарылася. Толькі праца аказалася няпростай.

Мы адбудоўвалі сьцяну, збудаваную пяць стагодзьдзяў таму. Рабілі гэта ў поўнай цішыні — размаўляць было нельга. Кожныя трыццаць хвілін узгаралася спрэчка: канечне мы размаўлялі — як старыя сябры, што ня бачыліся год, маглі не размаўляць? Брат Камень злаваўся. Аднойчы нават закрычаў на нас. У такія моманты было бачна, як сустракаюцца два сьветы, якія не разумеюць адзін аднаго. Брат Камень уцякаў у манастыр ад праблемаў таго сьвету, мы яму пра іх нагадвалі.

Другое і трэцяе абмежаваньні датычылі ежы: нельга было спазьняцца, і харчаваліся ў ранку, у





абед і ўвечары ў вызначаных месцах. Нават стол нельга было пасунуць на мэтар улева ці ўправа. Быў і дрэс-код: нельга было хадзіць у шортах у сьценах манастыра.

Манахі шмат падарожнічаюць. На нашае пытаньне «чаму?» яны адказалі вельмі проста: «Мы ж манахі, у нас багата часу». Расказваюць пра свае ўлюбёныя гарады — Нью-Ёрк, Лос-Анджэлес, Токіё. Вось такія яны, сучасныя праваслаўныя манахі.

**Тэкст і фота Андрэя Лянкевіча**











## АЛЕСЬ ВЯЛЕЙСКІ

БІЛЕТ ДА БЕЛАРУСІ

Прадавала касірка білеты
На вакзале аўтобусных зносін.
Прадавала касірка білеты —
Каму ў лета, каму — у восень.

Прадавала касірка білеты —
Каму ў шчасьце, каму — у згубу —
І калгасьнікам, і паэтам,
І самотнікам, і тургрупам.

Прадавала касірка білеты
Бестурботна і безгалоса,
І была падобная ў гэтым
На стваральніка Кнігі Лёсаў.

Прадавала касірка білеты
Безадмоўна (а так і мусіць).
Я спытаўся, надзеяй сагрэты:
«Калі ласка, да Беларусі...».

Раптам дзень зацягнула змрокам.
Узгадаўся мне «канец сьвету».
Я стаяў ля вакенца збоку
Са сваёй вялікаю мэтай.

Слухаў жальбы руплівай кабеткі:
«Гэта, ведаеце, пакута!..
Накірунак ваш вельмі рэдкі...
Вы прабачце, «завіс» кампутар...»

Прадавала касірка білеты
Тым, хто вырашыў і крануўся
У шырокі абсяг плянэты...
Мне ж хацелася Беларусі.

## ВАСІЛЬ

*Любай Зоі прысьвячаю*

* * *

Пасьвяці ты мне зоркай уначы,
Хай яна між аблокаў заблішча
І тваё нагадае аблічча,
Пасьвяці ты мне зоркай уначы.
Змрок, віхура ў небе засьвішча,
Буду я да сьвітаньня сачыць:
Пасьвяці ты мне зоркай уначы.

## КАЛЯНДАР

# Кастрычнік

**4** — 50 гадоў таму СССР вывеў на арбіту першы штучны спадарожнік Зямлі (1957).

**7** — 75 гадоў з дня нараджэньня пісьменьніка Івана Пташнікава (1932).

**10** — 50 гадоў з дня нараджэньня паэта Леаніда Дранька-Майсюка (1957).

**13** — Эйд аль-Фітр (заканчэньне Рамазану) у мусульманаў.

**14** — Пакроў у праваслаўных.

**16** — 50 гадоў таму нарадзіўся Сяржук Сокалаў-Воюш, бард і журналіст (1957).

**27** — 225 гадоў таму (1782) нарадзіўся італьянскі кампазытар і скрыпач Нікола Паганіні.

**27** — 170 гадоў таму (1837) памёр беларускі музыка і вынаходнік ксыляфону Міхал Гузікаў.

**29** — у гэты дзень у 1937 у Менску былі расстраляныя пісьменьнікі Алесь Дудар, Анатоль Вольны, Плятон Галавач, Міхась Зарэцкі, Валер Маракоў і яшчэ каля ста дзеячоў беларускай інтэлігенцыі. Гэты дзень ушаноўваецца як Дзень памяці ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў.

**31** — 25 гадоў таму памёр Міхась Ткачоў, беларускі гісторык і грамадзкі дзеяч (1982).



АНДРЭЙ КУЗЬНЕЧЫК

**ГОРАД З ДУШОЙ. Ля галоўнай урадавай трасы.**

# Зорка Міколы Селешчука

**З 11 кастрычніка ў Мастацкім музэі** пачне працу выстава жывапісу і графікі Міколы Селешчука, аднаго з самых знакамітых беларускіх мастакоў XX ст. Выстава прысьвечаная 60-годзьдзю зь дня нараджэньня мастака.
**Выставу можна наведаць да 10 лістапада 2007 г.**



# Мікола Селяшчук. Казачны калейдаскоп

Селяшчук ад пачатку мысьліў сябе графікам. Пра тое сьведчылі талент малявальніка, дакладнасьць думак і ахайнасьць у манеры. Зь першых ягоных твораў было відаць, што ў беларускае мастацтва прыйшоў незалежны і цалкам тутэйшы талент. Незалежны — падкрэсьлена. Нізка літаграфіяў «Ваенная заалёгія» з пацыфісцкімі алюзіямі і трывогай за прыроду, распачатая яшчэ за часамі навучаньня, выглядала ледзьве не дысыдэнцтвам на тле тагачаснае мастацкае думкі. Але аўтару тое даравалася. Бо рэпрэзэнтавала свабоду творчасьці і дасканалае мастакоўскае майстэрства за мяжою.

Нечаканым для самога Селешчука, эстэта і філёзафа, быў зварот да сацыяльных матываў у 80-я. Ці ён палічыў, што жывапіс мусіць падымаць «сур'ёзныя» тэмы? Аднак зварот да «бытавухі» абярнуўся крытычна-іранічным увасабленьнем таго самага рэалізму, да якога заклікала ўжо і савецкая традыцыя. Хацелі праўду — калі ласка. Сьвятло ночы, скрозь цыгарэтную смугу, у сынтэтычных бліках... «Кроніка аднаго вечара», «Матылькі тут не жывуць», «Трывогі мірнага дня». Як напісана ў «Гісторыі беларускага мастацтва», «публіцыстычная завостранасьць зьместу на тэме маралі, духоўнага жыцьця маладога пакаленьня характэрныя для ягонай творчасьці». Праўда, гэты паварот быў для Селешчука хутчэй выпадковым, чым характэрным. У кніжнай графіцы мастак дэманстратыўна працаваў на ўласную славу. Ілюструючы творы Янішчыц, Сіпакова, Бядулі, Коласа, Адамчыка, зборнікі беларускіх казак, ён імкнуўся стварыць ня толькі адпаведны літаратурнаму твору вобраз, але прымусіць адчуць яго па-іншаму. Адзін з найбольш яскравых прыкладаў тут — аздабленьне кнігі «Сымон-музыка» Якуба Коласа, якое стала сэнсацыяй, адкрываючы сьвет коласаўскага рамантызму й сусьвет рамантычнай беларушчыны Селешчука. Гульня зь філіграннымі дэталямі, нібы зь лялькамі ў кардонных батлейках, насычэньне кампазыцыяў сонмам дзіўных, *недавыказаных* пэрсанажаў, якія то лятуць, то плывуць, то растуць, ператварылася ў адметны мастакоўскі кшталт казачных летуценьняў.

Нібы ў палявых травах, у працах Селешчука мігцяць чароўныя кветкі, невядомыя казюркі й карузьлікі, фантастычныя істоты зь дзіцячых вясковых сноў, паўпеўні, паўрыбы, паўлюдзі. Але ва ўсім тым пярэстым карагодзе існуе жорсткая, дакладная структура, выверaная амаль фізіялягічна, як сама сьветабудова, што паўстала з хаосу. Структура, зададзеная межамі аркуша, рамаю карціны.

Сэнс і прызначэньне гэткага зьмяшэньня пэрсанажаў, фарбаў і, урэшце, тэхнікаў выкананьня — гульня. Сам мастак даў падказку да разуменьня сваёй творчасьці карцінаю «Ў майстэрні мастака лялек». З выпадковага стракатага хламу, недаробленых лялек, паперак, фрагмэнтаў, аскепкаў, урыўкаў, паўстае прадчуваньне Стварэньня. І сам мастак, засяродзіўшы свой позірк на *недарэчах*, гатовы ўдыхнуць у іх душу.

**Працяг на старонцы 30.**

# Мікола Селяшчук. Казачны калейдаскоп

**Працяг са старонкі 29.**

...Самы цёплы кут Беларусі, дзе жывуць хамякі, сусьлікі й вушастыя кажаны, дзе растуць самыя вялікія яблыкі, сланечнік і кукуруза, дзе самы белы пясок і самыя мядзяныя сосны — радзіма Селешчука. Крыху на поўдзень ад Берасьця. Вялікарыта. Увесь час ён імкнуўся экспанаваць графічныя аркушы, прысьвечаныя бацькоўскім мясьцінам («Сьвяточны стол у гонар нараджэньня брата», «Сыгналы мінулага часу» ды іншыя), на якіх, нібы скрозь паўдзённы летні сон, скрозь мільгацень сонечных плямаў, праступае то фрагмэнт хаты, то стала, то дрэва і безьліч драбнейшых фрагмэнтаў, што захаваліся ў памяці зь дзяцінства. Менавіта ў гэтых, блізу інтымных, аркушах і былі спраўджаныя асноўныя стылёвыя прыкметы селешчукоўскага мастацтва... «Казачны калейдаскоп» быў створаны ў 1984 г., калі і слава й пашана распахнулі абдымкі мастаку. І ён крочыў нарэшце туды, дзе пачуваўся абароненым, у свой сьвет, гэтак рупліва й ашчадна паклееny, сашпілены, зьлеплены. Пэрсанажы, што шматкроць былі апрабаваныя ў мініятурах эксьлібрысаў і кніг, сышліся на карціне разам. Вясёлыя дамы і званіцы, самотныя цені і лялечны певень на колках. Усё, што было ўзятае з кніг і аддадзенае кнігам, сышлося тут, на карціне графіка. Мастака Казкі. Захоплены ідэяй «Калейдаскопу», Селяшчук праз год піша працяг...

**Сяргей Харэўскі,**
**Друкавалася ў «НН», №8, 1999**

**Мікола Селяшчук**

(1947, Вялікарыта, Беларусь — 1996, Італія). Графік, жывапісец. У 1970 скончыў Менскую мастацкую вучэльню, пазьней, у 1976 — Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Работы зьберагаюцца ў калекцыях Беларусі, Баўгарыі, Францыі, Фінляндыі, Грэцыі, Нямеччыны, Польшчы, Экватарыяльнай Гвінэі.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК






МІКАЛАЙ ХАЛЕЗІН

# 10 кастрычніка 19.00

**У клюбе Фартуна (Менск, вул.Смаленская, 15)** пройдзе прэзэнтацыя альбому **N.R.M.** «06». Даведкі праз т.: 671–58–65

# N.R.M.

## КІНО

### Караткамэтражныя фільмы

**6 кастрычніка а 19-й у галерэі твораў Леаніда Шчамялёва** (пр. Ракасоўскага, 49) — паказ кароткамэтражных фільмаў з абмеркаваньнем. Можна будзе паглядзець «Дзень Незалежнасьці» (2006), «Маленькі сусьвет» і інш. Т.: 277–07–90. Дзяніс

## ВЫСТАВЫ

### Вясельле ў розных краінах

**Мастацкі музэй** (вул.Леніна, 20) прапануе інтэрактыўную культурна-адукацыйную праграму «Ў блаславёны дзень, у шчасьлівы сьвет каханьня!» Удзельнікі могуць пазнаёміцца зь вясельнымі традыцыямі XVIII—XIX ст. у Беларусі, Расеі і Японіі. **Праграма разьлічаная на 15 чалавек. Яе працягласьць — паўтары гадзіны.** Замовы праз т.: 227–45–62

### Людзі і манэкены

**Ад 5 кастрычніка ў Мастацкім музэі — выстава Вадзіма Аладава «Людзі і манэкены».** Яна прысьвечаная 100-годзьдзю Алены Аладавай, дырэктаркі музэю ў 1944 —77 г.

## ТЭАТРЫ

### Купалаўскі тэатар

**5 (пт)** — «Тапалевая завея».
**6 (сб)** — «Ідылія».
**7 (ндз)** — «Паўлінка».
**8 (пн)** — «Сымон-музыка».
**10 (ср)** — «Вольга».
**11 (чц)** — «Вечар».
**12 (пт)** — «Маэстра».
**13 (сб)** — «Смак яблыка».
**14 (ндз)** — «Макбэт».
*ранішія спэктаклі*
**7 (ндз)** — «Паўлінка».
**14 (ндз)** — «Сьнежная каралева».
*малая сцэна*
**5 (пт)** — «Дзікае паляваньне караля Стаха».
**8 (пн)** — «Варшаўская мэлёдыя».
**11 (чц)** — «Маці».
**12 (пт)** — «Адчыніце Кантралёру!»

### Тэатар беларускай драматургіі

**5 (пт), 14 (ндз)** — «Сёстры Псыхеі».
**6 (сб)** — «Чорны квадрат».
**7 (ндз)** — «Казачкі з куфэрачку».
**7 (ндз)** — «Адвечная песьня».
**9 (аўт)** — «Валянціна».
**10 (ср)** — «Палёты з анёлам».
**11 (чц)** — «Белы анёл з чорнымі крыламі».
**12 (пт)** — «Ганна ў тропіках».
**13 (сб)** — «Адэль».
**14 (ндз)** — «Дамавічкі».

## КІНО

# Фасбіндэр і Труфо

У Менску паказваюць кінаклясыку.

**Нуда Вэранікі Фос** (Sehnsucht der Veronika Voss)

Нямеччына, 1981, чорна-белы, 104 хв.

**Рэжысэр:** Райнэр Вэрнэр Фасбіндэр

**Жанр:** Мэлядрама-нуар

Нямеччына, 50-я. Спартовы аглядальнік Робэрт Крон падвозіць незнаёмку, якая ўцякла на вуліцу пад залеву з паказу даваеннага фільму. Яна — былая зорка нацысцкага кіно Вэроніка Фос. Зацікаўлены журналіст спрабуе дапамагчы гераіні, але перашкодаю — мінулае. Фасбіндэр ставіць дагары нагамі звыклую сымболіку колераў. Чорны — гэта дабро: цемра кінатэатраў, ціхая ноч, плашч герояахоўніка. Белы — зло: стэрыльныя халаты лекараў, сьвятло калідораў. Нацысцкія змовы, канцылярныя повязі ахвяры й ката, забойства, якое не прадухіліць…

**Андрэй Расінскі**

У кінатэатры «Перамога» дэманструюцца фільмы Райнэра Вэрнэра Фасбіндэра.
**4 (чц)** — «Страх зьесьці душа», 1974
**8 (пн)** — «Кітайская рулетка», 1976
**9 (аўт)** — «У год трынаццаці Месяцаў», 1978
**10 (ср)** «Нуда Вэранікі Фос», 1982
Усе сэансы а 19.00

У Музэі гісторыі кіно дэманструюцца стужкі Ф. Труфо.
**5 (пт)** — «Жуль і Джым», 1961;
**10 (ср)** — «451 па Фарэнгейце», 1966
**12 (пт)** — «Маладая была ў чорным», 1967
**17 (ср)** — «Скрадзеныя пацалункі», 1968
**19 (пт)** — «Амэрыканская ноч», 1973
**24 (ср)** — «Гісторыя Адэлі», 1975
**26 (пт)** — «Апошняе мэтро», 1980
**31 (ср)** — «Суседка», 1981
**2 (пт)** — «Хутчэй бы нядзеля!» 1983.
Сэансы а 15.00 і 18.30.

## КАЛІ Б...

**...супрацоўнікі КДБ сапраўды пачалі дэманстраваць моладзі дэструктыўны ўплыў Захаду.**



— Бачыш таго вэртыкальшчыка? Ведаеш, чаму ён такі тоўсты і несымпатычны? Бо езьдзіць на машыне, зробленай на Захадзе, глядзіць тэлек, зроблены на Захадзе, жарэ імпартныя прадукты, зробленыя на Захадзе...

МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

# Чалавек верасьня: Сяргей Сямёнаў

Пераможца апытаньня «НН»: Зараз трэба беларусізаваць ВНУ і войска. **Старонка 2.**

Шаноўны
Сяргей Харэўскі,
сябра і настаўнік!



У Дзень народзінаў жадаем Вам хутчэйшага папраўленьня, новых вясёлых падарожжаў на амаль як новай назе і новых цікавых тэкстаў!

**Сябры і вучні**

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Ад канторы «Нашай Нівы»**

Хто хоча ўзяць на прадажу «Нашу Ніву» і мець ад гэтага заработак, няхай прышле ў кантору свой адрас. Яму вышлюцца тагды варункі агентуры.

**«Наша Ніва». №34. 1907**




# А ты падпішыся!

Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву», проста падпішыце дамову. Дэталі — **старонка 17.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВЫШЫЎКА

**Запрашаем на курсы** беларускай народнай вышыўкі. Заняткі праводзяцца ў панядзелкі і аўторкі ў памяшканьні БНТУ (ранішняя і вячэрняя групы), альбо ў нядзелю (увечары) у памяшканьні Дому вэтэранаў. Пачатак заняткаў з кастрычніка. Выкладчык — майстар народнай творчасьці Рудніцкая Галіна Рэмаўна. Т.: 029–171–13–90.

### КНІГІ

**Запрашаем наведаць** выставу беларускіх кніг і музыкі на сядзібе ТБМ з 10.00 да 18.00 штодня апроч выходных

**Шукаю кнігу** Н.Ватацы «Песьня Максіма», Бібліятэчка газэты «Голас Радзімы», Мн., 1981. Т.:029–679–80–41.Тацяна

### ПРАЦА

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры, мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: 029–101–03–24. Юрась

**Якасны набор**, рэдагаваньне тэкстаў на беларускай мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: 029–101–03–24. Юрась

### НАБУДУ

**Nabudu dalkažyk** užytkavany, h.zn. były va užytku. Kantaktnyja tel.: 299–05–81, 955–92–54. Henik

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**Запрашаем у падарожжа** 7 кастрычніка (нядзеля) па маршруце: Менск—Мір—Навагрудак—Любча—Ліда—Іўе—Ліпнішкі—Дуды—Менск. 13 кастрычніка (субота): Беніца—Крэва—Баруны—Гальшаны—Вішнева—Дзясятнікі—Валожын. 3–4 лістапада: Вільня–Коўна. Т. 292–54–58; GSM 622–57–20; 509–12–16; 110–19–28

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**І.Р. з Горадні.** Паштовы індэкс на Ракасоўскага не ўказаны, бо адрас для допісаў у нас іншы: 220050, Менск, а/с 537.

**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| шэф-рэдактар | Андрэй Дынько |
| галоўны рэдактар | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| заснавальнік | Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва» |
| выдавец | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© НАША НІВА. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэкламных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 03.10.2007.

Замова № .

Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.